№ 10 (320) 14 сакавіка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Палітуцекачы ў пастцы эміграцыі



старонкі 6–7

### Васіль Быкаў

Зварот да Ўсебеларускага сходу інтэлігенцыі «Незалежная Беларусь — свабоднае і заможнае грамадзтва»

старонка 2

### Падпалкоўнікі ў Скарынаўскім цэнтры

Новыя рэаліі беларускай навукі.

старонка 12

### Лявон Вольскі

«Хачу паказвацца».

старонка 15

# Ад Садама з прыветам

**Менск пралётам з Іраку наведаў старшыня Дзяржаўнай думы Расеі Генадзь Селязьнёў. Напярэдадні Дня Канстытуцыі ён прывёз вітаньні ад Садама і праект расейска-беларускага канстытуцыйнага акту. Палітычная кар’ера Селязьнёва набліжаецца да бясслаўнага канца, заплянаванага Пуціным на сьнежаньскія выбары ў Думу. Дыктатура Хусэйна таксама дажывае апошнія дні. Лабызаньні Селязьнёва і вітаньні з-над Тыгру і Эўфрату глядзеліся як вялікі аўтсайд сусьветнае палітыкі. На абліччах «творцаў акту» не заўважалася аптымізму. Беларускія ўлады самі заблыталіся ў інтэграцыйным, ідэалягічным і канстытуцыйным павуціньні, якога наплялі за апошняе дзесяцігодзьдзе. Вырвацца зь яго можна было б праз канстытуцыйную рэформу. Пра яе разважаюць дэпутаты розных узроўняў (старонка 3).**



# Усебеларускі сход інтэлігенцыі

Усебеларускі сход інтэлігенцыі «Незалежная Беларусь — свабоднае і заможнае грамадзтва» адбудзецца 16 сакавіка ў памяшканьні менскага палацу культуры «Сукно» (вул. Матусевіча, 20). За арэнду памяшканьня (2400 тыс. рублёў) заплацілі самі дэлегаты, не шукаючы ніякіх грантаў. З кожнага ўдзельніка Сходу патрабаваўся арганізацыйны ўнёсак у памеры 5 тыс. рублёў. «Збор сродкаў працягваецца, — кажа адзін з сустаршыняў аргкамітэту Ўладзімер Колас. — Мы спадзяёмся, што зможам і даць падсілкавацца дэлегатам, і зладзіць культурную праграму».

Ад Менску на сход вылучаныя 230 чалавек. Пэўную квоту (да 50 асобаў) мае аргкамітэт. Вылучэньне дэлегатаў па абласьцях адбываецца яшчэ дагэтуль. Галоўнай «перашкодай» у масавасьці сходу стала поўная фінансавая незалежнасьць, якую паставілі сваёй мэтай арганізатары. На свой сход людзі мусяць ехаць за свае грошы. І чым далей жывеш ад Менску, тым большых выдаткаў вымагае дарога. Таму самымі шматлікімі на сходзе будуць дэлегацыі Менску ды Менскай вобласьці.

Тамара Мацкевіч, каардынатарка па сувязях з дэлегатамі Меншчыны, зазначыла, што ўжо па стане на сераду мае сьпіс з 101 асобы. Сходы прайшлі ў Маладэчне, Радашкавічах, Нясьвіжы, Барысаве, Салігорску, Слуцку, Нарачы, Вялейцы. У Крупках адбыліся аж два сходы.

Гарадзеншчына абрала 53 дэлегатаў з Мастоў, Ліды, Наваградку, Смургоняў і самой Горадні. Берасьцейшчына на момант падрыхтоўкі матэрыялу здолела вылучыць толькі каля 10 чалавек (зь Белаазерску, Івацэвічаў, Бярозы). «Вось-вось маюць адбыцца сходы ў Берасьці, Століне, Лунінцы. Берасьце абярэ шмат дэлегатаў», — зазначыла Алена Валынец, каардынатарка па сувязях з дэлегатамі Гарадзенскае, Берасьцейскае і Віцебскае абласьцей. Віцебшчына мела на сераду крыху менш за 40 дэлегатаў. Падрыхтоўчыя сходы прайшлі ў Віцебску, Гарадку, Воршы, Наваполацку, Шаркаўшчыне, Дрысе (Верхнядзьвінску), Глыбокім, Браславе, Бешанковічах, Лёзьне.

Дэлегацыя з Гомельшчыны складаецца з 35 чалавек (Гомель, Мазыр, Калінкавічы, Рагачоў, Лоеў, Тураў). Але, як кажа каардынатарка па вобласьці Натальля Арусіна, дэлегацыя мае павялічыцца за кошт вылучэнцаў зь Лельчыцаў, Сьветлагорску,

**Працяг на старонцы 3.**

# Слова Васіля Быкава

## да Ўсебеларускага сходу інтэлігенцыі



Калі гаварыць коратка і канкрэтна, дык варта зазначыць, што перад намі, як заўжды, два праклятыя пытаньні: хто вінаваты і што нам рабіць?

Зрэшты, на першае пытаньне адказ быццам бы знойдзены, і праблема, такім чынам, напалову зьнята, засталася другая яе палова. Але ў гэтай другой сабралася столькі праблемаў, што яны складаюць болей за палову, — ці ня ўсе самыя праклятыя праблемы засяродзіліся ў драконавым чэраве тае паловы.

Сапраўды, рабіць што?

Што ня ў сэнсе пустапарожняга дыскутаваньня ці шызафрэнічнай гістэрыкі пустазвонаў. Не ў майстэрскай імітацыі чыннасьці прафэсійных дэмакратаў ці нямоглых на справу нацыяналістых. А ў сэнсе практычнай прагматыкі, якая была б здольная на пэўны рацыянальны вынік. Найперш — вынік у галіне свабоды і незалежнасьці.

І тут узьнікае пытаньне: а ці сумяшчальныя між сабой тыя пастуляты — свабода і незалежнасьць? Прынята лічыць, што так. Толькі свабода, у тым ліку і свабода выбару, можа даць незалежнасьць, а незалежнасьць забясьпечыць свабоду. Але на практыцы мы ўбачылі, што тое — не зусім так, што ў той формуле яўна бракуе рацыянальнага сэнсу. Бо калі б ён там быў, дык быў бы вынік. А ў нас выніку — нуль.

Дык што ж нам рабіць?

Мяняць тактыку змаганьня? Але тактыка мае межы, і, мабыць, уся яна вычарпаная. Мяняць кіраўніцтва? Але якое на якое? Ці ня здарыцца так, што на месца кепскага старога прыйдзе яшчэ горшае новае? Рэвізаваць нашу старую нацыянальную ідэю, але ў якіх кшталтах? Можа, мяняцца самім (калі мець на ўвазе нашу нацыянальную эліту), але як і куды? Намагацца зьмяніць мэнталітэт электарату? Але тое ці ў нашай сіле? Калі таго мэнталітэту не зьмянілі стагодзьдзі яго паднявольнага існаваньня, ці магчыма тое за дзясятак гадоў тыраніі? Кажуць, што калі нацыя ня склалася за сто год, дык яна ўжо не складзецца ніколі. Ну а калі мы самі ў гэтым сэнсе ня надта ўдалыя, тады якое маральнае права мы маем патрабаваць зьменаў ад іншых? Хоць бы і ад тае субстанцыі, якую мы глыбакадумна называем электаратам?

Скрозь пытаньні і праблемы. А як вядома з Гегеля, найбольшая праблема ўзьнікае зусім не з канфлікту правага зь няправым, а менавіта з канфлікту правага з правым.

Ужо зразумела, што наш шаноўны электарат няздольны разьвязаць тыя заклятыя праблемы, іх прыйдзецца разьвязваць ягонай эліце. Правай і левай. Нацыянальнай і дэмакратычнай. Радыкальнай і лібэральнай.

З таго вынікае першая перадумова — аб'яднаньне.

Мы занадта слабыя, каб дзейнічаць паасобку, каб доўга вагацца — выбіраць і перабіраць, з кожнае нагоды круціць носам. Тым болей самаеднічаць, цягнуць да халоднай вайны ва ўласным стане.

Ня можам таго дазволіць сабе, бо інакш нас хутка ня стане. Ні правых, ні левых. Ні пэсымістых, ні аптымістых. Ні праведнікаў, ні вінаватых.

Ужо відавочна, што сьвет ідзе зусім не туды, куды яго скіроўваюць нашыя ўлады. Хоць бы Садам ці Лукашэнка. Ці нават Пуцін. Сьвет павярнуў у напрамку Буша. Але і ў тым кірунку месца для нас няма. Бо мы іншыя — занадта падлеглыя і талерантныя, з надта прыкметным бракам нацыянальнага эгаізму.

А там — панаваньне вялікай і магутнай сілы, якая, на жаль, не заўсёды ёсьць праўдай і справядлівасьцю. Хоць у шмат якіх выпадках менавіта так. Але сьвет зьменлівы, гісторыя парадаксальная. Нават ужо Бог у ёй не гарант. Што там можа наша зьняверaная, здушаная эліта і яе клясычны спакутаваны «цёмны крот», цяпер эфэктна званы электаратам.

Горш за ўсё тое, што час бясплённа мінае, а нашыя праблемы — ні зь месца. Дык што ж нам рабіць? Давайце раіцца.

**Васіль Быкаў, Прага**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Чаго чакае ад Сходу «НН»

Такія форумы застаюцца ў гісторыі нацыянальнага руху праявамі самаарганізацыі і выяўленьня волі. Яны працягваюць традыцыі вялікіх усебеларускіх соймаў XX ст. Гэтай пераемнасьцю нацыянальны рух дужы.

Ад чаго залежыць посьпех сходу, што можа зрабіць яго ня проста працягам традыцыі, а першым зьездам XXI ст.? Гэта адбудзецца, калі замест «абароны мовы» будзе дадзены старт аўтарытэтнай уніфікацыі беларускіх правапісаў. Слова Нілу Гілевічу. Калі замест «абароны духоўнасьці» будзе сфармуляванае стаўленьне да вайны ў Іраку. Слова Янку Брылю. Іншыя праблемы — канфлікт пуцінскай «дэмакратыі» і лукашэнкаўскага «аўтарытарызму», вечная фінансавая пятля на шыі прэсы, дзяльба Курапатаў. Калі сход унікне адвечных «гіне мова, незалежнасьць пад пагрозай», сканцэнтруецца на меншай колькасьці канкрэтных пытаньняў.

**Андрэй Дынько**

ТРЫБУНА ПАЛІТЫКА

# Абысьці пастку

У друку часьцяком гучаць папрокі палітычным партыям. Больш за ўсіх крытыкуюць людзі беспартыйныя. Сядзяць у хмызьняку і вучаць, як лепей зьмяніць уладу. А ацаніць партыю можна толькі зь сярэдзіны. Да хору крытыкаў далучыліся і некаторыя былыя сябры партый, палітолягі. Для прыкладу ўзгадаем артыкул У.Роўды «Няма такой партыі», надрукаваны ў «Белорусском рынке».

Цяперашняя ўлада Беларусі атрымала ў спадчыну ад КПСС таталітарныя мэтады кіраваньня. Стварыўшы партыю ўлады (прэзыдэнцкую вэртыкаль), яна так «удасканаліла» заканадаўства, што палітычныя партыі апынуліся ў «гета» без калючага дроту.



Яўген Лугін – былы старшыня Беларускае сялянскае партыі

Любая зарэгістраваная партыя знаходзіцца ў капцюрох дзяржструктураў, яе дзейнасьць пастаянна абмяжоўваецца, рост і ўплыў рэгулююцца. Слугі ўлады паліваюць партыі брудам, фармуюць імідж ворагаў народу. А інфармацыйная блякада не дае магчымасьці гэтую хлусьню абвергнуць.

Самае вялікае злачынства цяперашняй улады — страх, пасеяны ў душах людзкіх. Задумайцеся: чалавек баіцца ўлады. У нармальнай краіне людзі ўладу паважаюць. А калі яна не заслугоўвае павагі — мяняюць. У нас усё наадварот. Чыноўнікі трымаюцца на дзяржаўных пасадах не таму, што іх паважаюць, а таму, што іх баяцца. І ня могуць зьмяніць. Бо страх паралізуе дзейнасьць.

Ва ўмовах таталітарнай сыстэмы палітычныя партыі ня могуць выканаць сваіх функцый. Гэта ня іх віна, а бяда ўсяго грамадзтва. Дамогшыся афіцыйнай рэгістрацыі, партыі трапілі ў дзяржаўную пастку.

Трэба шукаць новыя формы грамадзкай дзейнасьці. І яны ўжо праявіліся. Так, без афіцыйнай рэгістрацыі дзейнічаюць многія партыі й грамадзкія арганізацыі: Беларуская партыя свабоды, «Малады фронт», «Хартыя'97», «Зубр» і іншыя. Адзіная нязручнасьць: згадваючы арганізацыю ў друку, трэба адзначаць, што яна незарэгістраваная. Інакш рэдактар газэты будзе мець праблемы. Але і выгадаў шмат: Мінюст іх не правярае, падатковая інспэкцыя не кантралюе, офіс можна мець на любой кватэры. Наагул, гэтыя арганізацыі ніякіх кантактаў з уладай ня маюць. Хіба што зь міліцэйскай дубінкай.

Але найбольш аптымальны варыянт грамадзкай дзейнасьці можна ажыцьцявіць у фармаце арганізацыйнага камітэту. Аргкамітэт — гэта такая часовая структура, якая плянуе нешта арганізаваць ці стварыць. Юбілей вядомага дзеяча, фэстываль культуры, дзяржаўнае сьвята, грамадзкае аб'яднаньне, партыя — усё гэта пачынаецца з фармаваньня аргкамітэту. У заканадаўстве аргкамітэт ня згадваецца. Яго ня трэба рэгістраваць.

Для аргкамітэту няма ніякіх абмежаваньняў: ні па часе дзейнасьці, ні па колькасьці ўдзельнікаў, ні па напрамках працы. Аргкамітэт можа выконваць функцыі аналітычна-інфармацыйнага цэнтру, грамадзкага аб'яднаньня, палітычнай партыі і нават выбарчага штабу.

Практычна робіцца так. Група грамадзян зьбіраецца на сход і дамаўляецца ўтварыць грамадзкае аб'яднаньне ці палітычную партыю. Гэтая фармальная дэклярацыя дае ім маральнае і юрыдычнае права сфармаваць аргкамітэт.

Аргкамітэт не рэгіструецца і не падае ў Мінюст сьпісу ўтваральнікаў, таму дзейнасьць у такім фармаце падаецца людзям найбольш бясьпечнай. Так увосень трэці год дзейнічае аргкамітэт «Зямля і Воля». За гэты час да яго далучыліся каля дзьвюх тысяч чалавек. Сярод іх шмат тых, хто раней не ўваходзіў у грамадзкія арганізацыі.

Многія суразмоўцы, якім я тлумачыў сутнасьць аргкамітэту і яго перавагі, пыталіся: «Гэта што, падпольле?» Безумоўна, гэта яшчэ не падпольле, але ўжо і не зусім адкрытая дзейнасьць. Аргкамітэт нагадвае айсбэрг: на адну трэціну на паверхні і на дзьве — пад вадой. Тут да месца будуць словы У.Някляева з паэмы «Палянэз»:

Тайнай сіла павінна быць,
Каб сілай стаць.

**Яўген Лугін**

ДРУКУЕЦЦА ЯК СПРЭЧНЫ

# Грахі ганарлівасьці й нацыяналізму



Даўно «НН» нічога не пісала пра справы нашых праваслаўных братоў і сясьцёр у дыяспары. Так і хочацца спытацца: а што робіцца ў БАПЦ пасьля ўладыкі Мікалая? Хто там першаярарх? Адлучаны япіскап Аляксандар ці хто іншы? А што робіцца ў другой частцы БАПЦ? І хто кіруе справамі Царквы: сам уладыка Ізяслаў ці сьвецкі Барыс Данілюк? А Эгідыюш Рыжы па-ранейшаму мянуе сябе япіскапам?

У гісторыі БАПЦ мяне ўражвае, як хутка сьвецкія асобы робяцца сьвятарамі, як лёгка іх — без акадэмічнае адукацыі, без паслушніцтва, працяглага манаства — хіратанізуюць у біскупы. Уразіла, як малады сьвецкі чалавек за тры тыдні стаў біскупам. І ўсё ж Аляксандра Салагуба не магу лічыць рэкардсмэнам сярод архірэяў, бо згадваю чытанае: у 381 г. базылеўс пасадзіў свайго фаварыта Нектарыя на канстацінопальскую катэдру адразу ж пасьля таго, як той ахрысьціўся, а на Захадзе ў сан біскупа ўзводзілі і хлапчукоў. Ды тое калі было? Не ў XX і не XXI стагодзьдзі.

Кадравы голад. І грэх ганарлівасьці. «НН» напісала, што прычыны расколу БАПЦ «былі хутчэй асабістымі», і, як ні круці, усё зводзіцца да яе, ганарлівасьці. І што ні кажы, а з боку несамавіта выглядае архірэй, пад амафорам у якога жменька парафіяў.

Яшчэ адна бяда — грэх нацыяналізму.

Грахі ганарлівасьці і нацыяналізму прывялі да схізмы ў Паўсюднай і Апостальскай Царкве, да падзелу Кафалічнае Ўсходняе Артадаксальнае Царквы на дзясяткі нацыянальных, да драбленьня нацыянальных. І ня можа стаць Усходняя Царква паўсюднаю, каталіцкаю, бо нацыянальнае душыць у ёй кафалічнае.

Многія ўкраінцы кажуць, што пасьпяшаліся з абвяшчэньнем Кіеўскага Патрыярхату і яго аўтакефаліі. У Галавы Царквы сумнеўная рэпутацыя, а значыць — ня вельмі добрая рэпутацыя і ў архірэяў, якіх ён хіратанізуе. Не абвяшчэньне аўтакефаліі гэта было, а самаабвяшчэньне. Без узгадненьня з архіяпіскапам Канстанцінопалю, з Папам і Патрыярхам Александрыі, Патрыярхам Антыяхіі і Патрыярхам Ерусаліму.

Пыха і нацыяналізм не дазволілі зрабіць правільны выбар. А вось філь зрабілі разумна: у свой час не аўтакефалію абвясьцілі, а перайшлі пад амафор архіяпіскапа Новага Рыму. І эстонцы, адыходзячы нядаўна ад РПЦ, пайшлі пад ягоны амафор. Масква сердавала і сярдуе, але што яна можа зрабіць першаму сярод патрыярхаў Усходу? З другога боку, архіяпіскап Новага Рыму ня можа пакінуць без апекі праваслаўных, якія просяць яго быць пастырам.

З тае пары, як архіяпіскап Канстанцінопалю перастаў быць галавою Эладзкае Царквы і закладнікам султана, аднавіўся кафалічны характар Канстанцінопальскае Царквы, якая называе сябе Сусьветнаю. (Гэта не замінае ёй падтрымліваць добрыя адносіны з Апостальскай Сталіцай, старым Рымам). Не чуваць, каб нехта ў гэтай Царкве жаліўся, што яму не даюць маліцца Богу і славіць Яго ў роднай мове. І асобныя беларускія праваслаўныя парафіі ў замежжы, што ў свой час перайшлі ў юрысдыкцыю Сусьветнае Патрыярхіі, не імкнуцца ў БАПЦ, якую разьядаюць сваркі і звадкі, анатэмы і адлучэньні.

Калі б ня пыха і нацыяналізм яраpхаў ды сьвецкіх, БАПЦ з сагнутаю шыяю мусіла б пайсьці пад уладу Сусьветнае Патрыярхіі. Глядзіш, і тут было б лягчэй сьвятарам і парафіям, якія ня хочуць хадзіць пад Масквою: яны маглі б пераходзіць пад амафор эміграцкага япіскапа, прызначанага Новым Рымам. І тады Маскве й афіцыйнаму Менску трэ было б нейк тлумачыць, чаму яны маюць дзёрзкасьць перасьледаваць дзяцей Сусьветнае і Праваслаўнае Царквы.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Канстытуцыйная рэформа

Гісторыя такая, якая яна ёсьць. У тым ліку і мінулыя 10 гадоў. Марна аспрэчваць гісторыю, яе трэба аналізаваць. Лукашэнкавы рэфэрэндумы кlаліся на псыхалёгію постсавецкага беларуса, як масла на хлеб. Яны былі папулісцкія, таму і спрацавалі — і пра інтэграцыю, і пра канцэнтрацыю ўлады ў адных руках, і пра мову, і пра сымболіку. Але гэта было сем-восем гадоў таму. За гэты час постсавецкі беларус зьмяніўся, зьмяніліся і краіна, і СНД, і сьвет. Тыя папулісцкія захады ўжо не працуюць, выглядаюць перашкодай на шляху разьвіцьця Беларусі. Можна прызнаць іхную эфэктнасьць сем-восем гадоў таму, але трэба прызнаць і іхную часовасьць. Падзеі ў нацыянальным сходзе («круглы стол» да 85-годзьдзя БНР), Украіне (апошнія канстытуцыйныя прапановы Кучмы), Расеі (якія знайшлі адбітак у дзейнасьці новага расейскага пасла Блахіна) — той унутры- і замежнапалітычны кантэкст, які гэтую часовасьць пацьвярджае. Да пытаньняў уладкаваньня палітычнае сыстэмы, падзелу ўладаў, мовы і нацыянальнае сымболікі актуальна было б вярнуцца. Гэта быў бы прагрэсіўны крок, альтэрнатыва якому — стаяць на месцы і не разьвівацца як дзяржава.



Раней пытаньне канстытуцыйных зьменаў больш хвалявала «вуліцу», цяпер яго абмяркоўваюць Сход інтэлігенцыі ды аналітычныя інстытуты прэзыдэнцкае адміністрацыі.

IREX-PROMEDIA

## Якія канстытуцыйныя зьмены патрэбныя нашай дзяржаве?

На пытаньне адказваюць новаабраныя дэмакратычныя дэпутаты мясцовых саветаў і дэпутаты палаты прадстаўнікоў.

**Ірына Вештарт, Смургоні, «Народная Грамада»:** Падабалася мне ранейшая структура ўлады, калі быў у нас Вярхоўны Савет. Дэпутаты абіраліся пэрсанальна ад кожнае акругі, а не ад нейкіх нікому не вядомых дэпутацкіх карпусоў. Яшчэ нешта ў старыя часы я датэрміновага галасаваньня ня бачыла і лічу, што непатрэбнае яно. Колькі прыйшло людзей у дзень выбараў, столькі прыйшло. Сёньня нікога не цікавіць жыцьцё простага чалавека, часта бяспраўнага, які ў існай сытуацыі ня мае ўплыву на абіраньне ўлады. Тут і сымболіка не дапаможа.

**Вольга Галубовіч, Сьвіслач (Пухавіцкі раён), БНФ.** Мову беларускую трэба зрабіць адзінай дзяржаўнай, але паступова. Хацелася б, каб Беларусь стала парлямэнцкай рэспублікай. Хай бы прэзыдэнт выконваў прадстаўнічыя функцыі — як у Нямеччыне.

**Ігар Баслык, дэпутат палаты прадстаўнікоў, група «Рэспубліка»:** У нас парушаны балянс галінаў улады: выканаўчай, заканадаўчай і судовай. Хацелася б яго аднавіць. Пытаньне наконт нацыянальнай сымболікі важнае, але найперш павінны разабрацца гісторыкі. Яго трэба шырока абмеркаваць у грамадзтве, бо існуюць самыя розныя думкі. Таму варта даведацца пра пазыцыю нашых людзей.

**Юры Зянковіч, Ждановічы, БНФ:** Вярнуць варта падкантрольнасьць выканаўчых органаў улады мясцовым саветам. Добра было б таксама аднавіць пастанову, паводле якой пэўны працэнт ад падаткаў, сабраных на «падкантрольнай тэрыторыі», выдаткоўваўся б на патрэбы саветаў. Дый магчымасьць адсочваць, на што йдуць бюджэтныя грошы, не зашкодзіла б. Але апошняе немагчыма, пакуль старшыні выканкамаў будуць прызначацца зьверху.

**Сяргей Скрабец, дэпутат палаты прадстаўнікоў, група «Рэспубліка»:** Канстытуцыю 1994 г. ня варта вяртаць. Трэба зьмяніць яе з улікам сёньняшняга часу і цяперашняй тактыкі. Варта зьмяніць сыстэму выбараў у парлямэнт, пашырыць яго паўнамоцтвы і абмежаваць паўнамоцтвы прэзыдэнта. Што да мовы, то ў нас, паводле Канстытуцыі, дзьве дзяржаўныя мовы. Ня варта вяртаць нацыянальную сымболіку, зноў бударажыць грамадзкую думку. Быў жа рэфэрэндум. А ў нас ёсьць больш надзённыя праблемы.

**Рамуальд Улан, Смургоні:** У выніку рэфэрэндуму 1996 г. утварыўся дысбалянс розных галінаў улады. У нас кіруе выканаўчая ўлада, а заканадаўчая адсунута на другі плян, як і судовая. Калі судзьдзя прызначаецца прэзыдэнтам, пра якую незалежнасьць суду можна гаварыць?! А тая ж палата прадстаўнікоў ня мае сваіх фінансавых сродкаў… Таму трэба аднавіць скасаваны балянс уладаў. Што да мовы і сымболікі... Усё больш нашых грамадзянаў усьведамляюць, што жывуць у незалежнай дзяржаве. Але застаецца нямала і такіх людзей, якія гэтага не прымаюць. Таму цяпер трэба далей працаваць з народам, разьвіваючы здабыткі адраджэнскага руху пачатку 1990-х.

**Алесь Чыгір, Бабруйск:** Трэба зьмяніць выбарчае заканадаўства. У нас мусіць быць прапарцыйная сыстэма выбараў, што стымулявала б разьвіцьцё палітычных партыяў. Зьмяняць нацыянальную сымболіку яшчэ не пара. Варта яе спачатку папулярызаваць у народзе, а не вяртаць пастановай «зьверху». А беларускую мову трэба актыўна ўводзіць на ўсіх узроўнях жыцьця грамадзтва.

**Леанід Гаравы, Гарадок, сацыял-дэмакрат:** Спрэчнае палажэньне пра дзьвюхпалатнасьць, якое дзейнічае цяпер. Варта было б канстытуцыйна замацаваць ролю партый у выбарчым працэсе. Тое, што падносілася як перавага францускага досьведу, не спрацавала. Папулісцкія артыкулы «пра гарантаваны дзяржавай узровень жыцьця» таксама толькі дыскрэдытуюць дзяржаву.

**Сьвятлана Андруховіч, Мачулішчы, БНФ:** Трэба адмяніць «вэртыкаль» — прызначэньне прэзыдэнтам старшынь выканкамаў усіх узроўняў — і ўвесьці выбарнасьць мясцовых кіраўнікоў. Нацыянальную сымболіку трэба вяртаць. Я сама расейка, але ня супраць і вяртаньня беларускай мовы.

**Валеры Фралоў, дэпутат палаты прадстаўнікоў, група «Рэспубліка»:** Самае галоўнае, што трэба вярнуць, — гэта паўнамоцтвы парлямэнту. Калісьці быў складаны пэрыяд, калі цэнтральная ўлада мусіла быць цьвёрдай. Але тая цьвёрдасьць выклікала дысбалянс галінаў улады. Пытаньні пра сымболіку і беларускую мову — ня самыя галоўныя на сёньня. Куды важнейшыя цяпер праблемы эканомікі, захаваньня суверэнітэту, абароны правоў чалавека і г. д. Самае галоўнае — гэта жыцьцё людзей, ягоная якасьць.

**Сяргей Ёрш, Мікола Бугай**

# ...сход інтэлігенцыі

**Працяг са старонкі 1.**

Гомелю. Некалькі дзясяткаў дэлегатаў, як запэўнівае У.Колас, дашле Магілёўшчына.

Яшчэ У.Колас зазначыў, што на сход змогуць патрапіць ня толькі дэлегаты, але і запрошаныя госьці. Ахвотныя прыняць удзел у форуме ў якасьці гасьцей мусяць зьвярнуцца ў аргкамітэт (вул. Румянцава, 13, 220005, Менск. Тэл./факс: (017) 284-85-11). Нават у суботу яшчэ ня будзе позна.

Ня будуць зачыненыя дзьверы сходу і для прадстаўнікоў тых гарадоў і раёнаў, дзе не адбыліся мясцовыя сходы па вылучэньні дэлегатаў.

У.Колас зазначыў: «Гэтыя людзі змогуць зарэгістравацца ў палацы «Сукно», і мы зацьвердзім іх паўнамоцтвы на самім сходзе».

16 сакавіка ў палацы культуры «Сукно» адбудзецца своеасаблівы «парад аўтарытэтаў». З дакладамі маюць выступіць Уладзімер Парфяновіч, Жанна Літвіна, Мікола Маркевіч, Станіслаў Багданкевіч, Іван Нікітчанка, Леанід Злотнікаў, Уладзімер Конан, Пётра Садоўскі, Андрэй Курэйчык, Аляксей Марачкін, Алег Трусаў ды інш. Асноўнымі дакладчыкамі стануць Валер Карбалевіч, Генадзь Лыч і Ўладзімер Колас.

**Аркадзь Шанскі**

**«Наша Ніва» запрашае**

да супрацоўніцтва рэклямныя агенцтвы і агентаў па рэкляме на выгадных умовах. Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.

Т./факс: 284-73-29.



**Наша Ніва**

Нагадваем, што падпіску на другі квартал прымаюць да **18 сакавіка**. Падпісны індэкс **63125**. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».

Дык падпісвайся!



# Самы кароткі марш



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Каля чатырох тысяч чалавек выйшлі ў Менску на «Марш за лепшае жыцьцё» — меньш, чым чакалі арганізатары. Кардоны спэцназу загарадзілі людзям дарогу ў цэнтар. Пасьля церцяў зь міліцыяй каля заводу «Белвар» лічба маніфэстантаў паменшала. Акцыя скончылася ля Акадэміі навук. Сярод затрыманых пасьля маршу — Цімох Дранчук, Людміла Гразнова, Зьміцер Бандарэнка і Андрэй Саньнікаў.**

## Беларусь у «сяброўскім коле Эўразьвязу»

**Эўракамісія вызначыла стратэгію адносінаў з краінамі — суседкамі ЭЗ на дзесяць гадоў наперад.** Беларусь, Украіна, Расея, Малдова, 10 дзяржаваў Паўднёвага Прычарнамор’я названыя «сяброўскім колам найбліжэйшых суседак». У пэрспэктыве на іх распаўсюдзяцца «чатыры свабоды ЭЗ»: свабода перасоўваньня людзей, тавараў, паслугаў і капіталаў.

## Павышэньне ўплыву Кабякова

**Генадзь Навіцкі пераразьмеркаваў абавязкі між сваімі намесьнікамі.** Цяпер пытаньнямі сацыяльнае абароны будзе займацца не Андрэй Кабякоў, а Ўладзімер Дражын. Апошні ж перадаў Кабякову кантроль над Міністэрствам гандлю. Камітэт па энэргаэфэктыўнасьці перададзены пад загад Анатоля Цюцюнова з-пад Сяргея Сідорскага. Перамены можна расцэньваць як далейшае павышэньне ўплыву А.Кабякова.

## Пратэкцыянізм на рынку хлеба

**Урад увёў абмежаваньні на пастаўкі замежнага хлеба.** З 1 сакавіка і да канца 2003 г. для ўвозу ў краіну хлебных вырабаў патрабуецца ліцэнзія ад Мінсельгасхарчу. Каштуе яна каля 500 тыс. рублёў за тону хлебапрадуктаў. Скіраваная пастанова супраць імпарцёраў таннага хлеба з Расеі.

## Новы прэс-сакратар МЗС

**Прэсавым сакратаром дыпляматычнага ведамства прызначаны Андрэй Савіных.** Яму 40 гадоў. У МЗС — з 1993 г. Працаваў у беларускім пасольстве ў Нідэрляндах, начальнікам аддзелу інфармацыі МЗС. Ягоныя папярэднікі Мікалай Барысевіч і Павал Латушка цяпер знаходзяцца на дыпляматычнай працы ў Чэхіі й Польшчы.

## Паліва падаражэла

**На 10% падаражэлі дызпаліва і бэнзын.** Падвышэньне адбылося праз тое, што ўрад вывеў прадукты нафтахіміі зь пераліку сацыяльна значных тавараў. Літар бэнзыну А-95 каштуе каля 1135 руб., А-76 — пад 795 руб.

## Урад мадэрнізуе правінцыйныя друкарні

**Урад працягнуў на 2003—2004 г. праграму падтрымкі цэнтралізаванае сыстэмы друку гарадзкіх і раённых газэтаў.** Міністэрства інфармацыі абяцае цягам двух наступных гадоў закупіць шэсьць камплектаў абсталяваньня для вырабу афсэтных друкарскіх формаў, колерадзяленьня і газэтнага друку, што дазволіць павялічыць аб’ём абласных і раённых выданьняў і друкаваць іх у колеры.

## Нам па зубах індыйскі танк

**Беларусь возьме ўдзел у тэндэры па мадэрнізацыю танкаў Т-72 індыйскага войска.** Ёй займаюцца 140-ы рамонтны завод (Барысаў) сумесна зь менскім ААТ «Пэленг». Заявы на ўдзел у тэндэры падалі таксама кампаніі ЗША, Ізраілю, Францыі, Польшчы, Расеі й Украіны.

## Банкет у гонар БНР

**Прадстаўнікі беларускай эміграцыі адзначаць 85-ю гадавіну незалежнасьці ў Нью-Ёрку, на Мангэтане.** Урачыстасьць адбудзецца 16 сакавіка ў залі «Украінскага дому». У праграме — афіцыйная частка, канцэрт беларускіх артыстаў, сьвяточны абед. Цана ўваходнага білету 35 даляраў.

## Тодару Кляшторнаму

**Да сотае гадавіны з дня нараджэньня Тодара Кляшторнага ў Камені (Лепельшчына), на ягонай радзіме, адчыніўся музэй.** Тымі самымі днямі зьявіліся сыгнальныя экзэмпляры зборніка Т.Кляшторнага, выдадзенага дбаньнямі Саюзу пісьменьнікаў і Беллітфонду. Гэтак СП вырашыў «сплаціць доўг» расстралянаму паэту, кажа Алесь Пашкевіч, аўтар прадмовы да кніжкі.

## Дрэйф на Белым

**На возеры Белым (ля Белаазерску) адламалася крыга плошчай каля 1,5 кв.км і разам з усімі рыбакамі, што на ёй сядзелі, паплыла на сярэдзіну.** Калі б у аднаго рыбака не аказалася сотавага тэлефона, па якім ён затэлефанаў 01, растала бы тая льдзіна на цёплай плыні, што ідзе ад ДРЭС. Усе 347 чалавек зьнятыя зь лёду. Ахвяраў няма.

## Помнік савецкаму маршалу

**У Менску адбылася прэзэнтацыя праекту помніка савецкаму маршалу Георгію Жукаву,** які служыў у Беларускай вайсковай акрузе ў 1922—39 г. Ставіць манумэнт зьбіраюцца ля Дому афіцэраў, хоць будаўніцтва новых аб’ектаў у гістарычным цэнтры гораду забаронена. 150 тыс. даляраў на помнік будуць «прасіць» у беларускіх прадпрыемстваў.

## Беларуская песьня ў Польшчы

**У Беластоку адбыўся гала-канцэрт Х Агульнапольскага фэстывалю «Беларуская песьня-2003».** Удзел бралі каля 30 выступоўцаў з Падляшша і Варшавы. Ладзіцца фэст пад патранатам міністра замежных справаў Польшчы Ўладзімера Цімашэвіча.

**СМ; БелаПАН, радыё «Свабода», БелТА**

**З УСЁЙ КРАІНЫ**

## Падманулі дзеда

**У вёсцы Людкаўшчына Аршанскага раёну да аднаго дзядулі завіталі дзьве добра ўбраныя маладзіцы на легкавіку.** Назваўшыся супрацоўнікамі банку, яны паведамілі вяскоўцу, што грашовыя сыстэмы Беларусі й Расеі аб’ядналіся і таму праводзіцца абмен беларускіх грошай на расейскія. Даверлівы дзед дазволіў махляркам «абмяняць» ягоныя 400 тысяч рублёў на некалькі каляровых паперак па «100 бабак», якія выкарыстоўваюцца ў Расеі як закладкі для падручнікаў. Такі выпадак на Аршаншчыне ўжо ня першы. Ён сьведчыць ня толькі аб празьмернай даверлівасьці нашых старых, але і пра іхную палітычную недасьведчанасьць... пісьменнасьць, якой спрытна карыстаюцца розныя прайдзісьветы, ды не адны крымінальныя.

## Разьвітаньне зь зімой

**Традыцыйнае сьвята «Праводзіны зімы» адбылося ў Воршы.** Дзясяткі дарослых і дзяцей удзельнічалі ў конкурсе сьнежных фігур. Чаго толькі ні зьляпілі: «Русалку», «Рыбу-кіта», «Замак», «Тэлепузікаў», нават «Аўрору». Але ўся гэта прыгажосьць не паставіла й да вечару. Большасьць скульптур разбурылі тыя, хто частаваліся больш гарэлкай, чым блінамі. У апошні час усе гарадзкія вулічныя сьвяты ператвараюцца ў суцэльную п’янку, дзе ад старэйшых не адстае моладзь. Вось і пасьля гэтага на сьнезе засталася ня толькі процьма пустых бутэлек ды бруду, але сям-там плямы крыві, бо без разьбітых насоў у нас не абыходзіцца. Толькі намаганьнямі вялікай колькасьці міліцыі была папярэджаная бойка паміж групоўкамі моладзі, т.зв. «раёншчыкамі», ля Палацу культуры льнокамбінату.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

## Ivaškievič «nie apraŭdaŭ davieru»

**Niadoŭha pabyŭ Viktar Ivaškievič staršyniom samakiravańnia ŭ Baranavickim papraŭčym izalatary adkrytaha typu.** Praź niekalki dzion taja pasada viarnułasia da Viktaravaha papiarednika. Jak patłumačyli supracoŭniki «chimiji», na hetuju hanarovuju pasadu, pavodle zakonu, moža vybiracca tolki čałaviek, jaki staŭ na šlach vypraŭleńnia. A Ivaškievič nie pryznaje dahetul svajoj viny.

## Pryvatny zavod

**Baranavičy i vakolicy ŭsio bolš robiacca padobnymi da Čykaha 20-ch hadoŭ XX st.** 25 lutaha milicyjanty vyjavili ŭ vioscy Małyja Łuki bolš za 100 skryniaŭ padroblenaj harełki i šmatlikija jomistaści dla zachoŭvańnia śpirtu. Kanfiskavany surahat kaštavaŭ bolš za 7 mln. rubloŭ. Chata, dzie mieściŭsia «harełačny zavodzik», naležyć žycharcy Baranavič.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## Міні-аўтастанцыя ў Міхалішках

**Кіраўніцтва астравецкага аўтапарку №4 плянуе зрабіць міні-аўтастанцыю ў вёсцы Міхалішкі.** Гэта дазволіць зьменшыць затраты на перавозку пасажыраў з далёкіх вёсак. У Міхалішкі (каля 50 км ад Астраўцу) зь невялікіх вёсак людзей будуць падвозіць мікраадбусы. Іх мяркуюць набыць чатыры штукі. А ўжо ў Астравец пасажыраў будзе дастаўляць «ЛАЗ».

## Мэдсястра крала наркотыкі

**Ашмянскія апэратыўнікі выявілі факт крадзяжу наркатычных рэчываў.** Яшчэ летась мэдсястра прыёмнага пакою Ашмянскага ТМА скрала 20 ампулаў псыхатропнага рэчыва «Дыязэпэкс», да якога мела доступ. Хутка за гэта ёй давядзецца адказваць у судзе.

**Мяр’ян Вянгроўскі, Астравец**

## Зьвяры пашалелі

**Вёску Горталь, што на Івацэвіччыне, атакаваў воўк.** Разгульваючы па сялянскіх падворках, шэры драпежнік пакусаў трох жанчын, адну карову і сем сабак. Няпрошанага госьця ўрэшце забілі паляўнічыя. Экспэртыза выявіла, што зьвер хварэў на шаленства. Пацярпелых кабет адвезьлі ў раённую бальніцу. Пакусаных сабак давялося зьнішчыць, а карову вакцынуюць.

Крыху раней некалькі жыхароў вёскі Сьвятая Воля закалолі вілкамі лісіцу, якая таксама хварэла на шаленства. У вёсцы зробленыя падворны абыход, вакцынацыя свойскай жывёлы. Зьнішчана 15 бадзяжных сабак.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

## Палякаў цікавіць мядзельскі фальклёр

**Упадабалі польскія студэнты мядзельскую глыбінку: другі раз за паўтара году прыяжджалі яны сюды.** Студэнты Варшаўскага ўнівэрсытэту жылі па людзях у вёсках Старлыгі і Міцынеты. Хадзілі па хатах, распытвалі старэйшых жыхароў пра чараўнікоў, шаптуноў і тое, як раней жылося. Запісвалі ўсё на дыктафон, фатаграфавалі. Палякам спадабалася ў вёсках, дый бабулькі былі радыя, што знайшлі ўдзячных слухачоў. Дзе-нідзе студэнтам і падарункі давалі: ручнікі, саматканае палатно, зёлкі ад хвароб.

## Банкаматы ў вёсках

**На Мядзельшчыне ўжо 12 крамаў, дзе можна разьлічыцца з дапамогай плястыкавых картак ад «Беларусбанку».** Гэта магчыма ў населеных пунктах «курортнае зоны», кшталту Кабыльніка. Яшчэ ў некаторых вёсках можна атрымаць грошы па картках у аддзяленьнях банкаў.

**Алесь Высоцкі, Мядзел**

# Кучма прапануе дзяржаўную рэформу

**Украінскі прэзыдэнт прапанаваў зьмяніць канстытуцыю краіны і зрабіць апошнюю парлямэнцка-прэзыдэнцкай рэспублікай. Узамен за гэта ён хацеў бы падоўжыць тэрмін сваіх паўнамоцтваў. Намесьнік генпракурора тым часам прызнаў, што забойства Гангадзэ магло быць справаю спэцаддзелу МУС.**



АР
Лідэры апазыцыі Юлія Цімашэнка і Віктар Юшчанка

Дзясяткі тысяч жыхароў украінскай сталіцы ўзялі ўдзел у антыпрэзыдэнцкім мітынгу ля помніка Шаўчэнку ў дзень нараджэньня паэта-прарока. «Гэтая дэманстрацыя нічога ня зьменіць, але я прыйшоў сюды, каб паказаць, што я за дэмакратыю. Калі перастанем выходзіць на вуліцы, будзем узмацняць аўтарытарызм», — кажа Максім Стрыха, вядомы кіеўскі публіцыст — аўтар «НН». На сходзе была прынятая рэзалюцыя з патрабаваньнем датэрміновых прэзыдэнцкіх выбараў, вызваленьня палітвязьняў, скасаваньня цэнзуры на тэлебачаньні і забароны павышэньня камунальных плацяжоў.

Аднаўленьне кампаніі «Паўстань, Украіна» супала з кучмаўскаю прапановаю трансфармацыі ўкраінскай палітычнай сыстэмы з «прэзыдэнцка-парлямэнцкае» ў «парлямэнцка-прэзыдэнцкую». Кучма прапанаваў, каб права прызначаць прэм'ера і большасьць міністраў, акрамя міністраў абароны, унутраных і міжнародных справаў ды надзвычайных сытуацый, адышло парлямэнту. Праект прадугледжвае таксама, што прэзыдэнт будзе мець права распускаць парлямэнт, калі той ня зможа сфармаваць большасьць, прызначыць урад або прыняць бюджэт. Праект прадугледжвае стварэньне дзьвюхпалатнага заканадаўчага органу ў складзе 300-мясцовага Дзяржаўнага сходу, абіранага па партыйных сьпісах, і Палаты рэгіёнаў на 81 месца, у якой трыма дэпутатамі былі б прадстаўленыя кожная вобласьць, Крым, Кіеў і Севастопаль. Згодна з задумай, прэзыдэнта, парлямэнт і дэпутатаў мясцовых саветаў будуць выбіраць у той самы год (парлямэнт у сакавіку, мясцовыя саветы ў верасьні, а прэзыдэнта ў сьнежні). Кучма таксама хоча, каб вынікі нацыянальных рэфэрэндумаў мелі простую сілу і не патрабавалі зацьвярджэньня парлямэнтам.

Апазыцыя сустрэла кучмаўскую прапанову крытыкай. На думку лідэра сацыялістаў Аляксандра Мароза, праект «непераканаўчы і цьмяны», а галоўнай мэтай яго зьяўляецца або роспуск цяперашняга парлямэнту, у якім апазыцыя мае 45% месцаў, або падаўжэньне Кучмавых паўнамоцтваў. Лідэр правацэнтрысцкай «Нашай Украіны» Віктар Юшчанка заявіў, што такія прапановы маюць адну задачу — «прыхаваць нежаданьне ўладаў стварыць празрыстую палітычную сыстэму».

Праціўнікі праекту лічаць, што ў выпадку яго прыняцьця ўхваленьня Вярхоўнай Радай наступныя парлямэнцкія і прэзыдэнцкія выбары мусяць адбыцца ў адзін год. А гэтым годам стане не 2004-ы, калі паўнамоцтвы Кучмы сканчаюцца, а 2006-ы, калі выгасае тэрмін працы парлямэнту.

Усе выступоўцы на Шаўчэнкаўскім дні выступалі за яднаньне апазыцыі. Лідэр камуністаў Пятро Сіманенка, цытуючы клясыка, заклікаў народ узьняцца супраць «паноў і іх украінскіх наймітаў». Юшчанка заявіў, што Кучму ўдалося перамагчы на выбарах 1994 і 1999 г., раскалоўшы апазыцыю на левую і правую. «На выбары 2004 г. мы любой цаной мусім выставіць адзінага кандыдата», — заклікаў ён.

Ягоныя словы падхапіла Юлія Цімашэнка: апазыцыя ня мае права дзяліцца на лявіцу і правіцу, украінскамоўных і расейскамоўных.

Тым часам урад абвясьціў пра афіцыйнае адзначэньне 85-х угодкаў былога першага сакратара Кампартыі Ўкраіны Ўладзімера Шчарбіцкага (1972—1989).

А намесьнік генэральнага пракурора краіны Віктар Шокін прыняў кіраўніка міжнароднай арганізацыі «Рэпарцёры бязь межаў». Вынікі сустрэчы былі сэнсацыйнымі. Прадстаўнік пракуратуры прызнаў: «Нельга адкінуць вэрсію, што Гангадзэ забілі супрацоўнікі МУС». Мэнар пайшоў далей: гэта магла быць справа рук спэцаддзелу міністэрства і імёны канкрэтных выканаўцаў ужо ўстаноўленыя пракуратурай. На стужках, запісаных ахоўнікам Кучмы маёрам Мельнічэнкам, фігуравала МУСаўская група «Арлы». Маці Гангадзэ, Леся, азнаёмілася з поўнымі вынікамі экспэртызы трупа, знойдзенага ў лесе пад Кіевам неўзабаве пасьля зьнікненьня журналіста. Швайцарскія крыміналісты пацьвердзілі: гэта сапраўды парэшткі Георгія Гангадзэ.

**Мікола Бугай, Кіеў—Менск**

## Забіты сэрбскі прэм'ер



АР

Сэрбскага прэм'ера Зорана Джынджыча застрэлілі перад будынкам ураду ў Бялградзе. Кулі трапілі яму ў жывот і ў плечы. Прэм'ера адвезьлі ў шпіталь, аднак ўратаваць ягонае жыцьцё не ўдалося. Не дапамагла й апэрацыя. У сувязі з забойствам паліцыя схапіла дзьвюх асобаў. Адзін з арыштаваных параненьы.

У часе папярэдняга замаху, у лютым, Джынджыч выжыў толькі цудам. Грузавік загарадзіў дарогу ягонаму лімузыну, аднак сутыкненьня не адбылося. «Той, хто думае, што, прыбраўшы мяне, спыніць рэформы ў краіне, моцна памыляецца», — казаў Джынджыч у адным зь нядаўніх інтэрвію.

### Бандажэўскі — ганаровы парыжанін

**Радыёляг Юры Бандажэўскі прызнаны ганаровым грамадзянінам Парыжу.** Асабіста падзякаваць за такі гонар прафэсар ня мог, бо адбывае пакараньне ў калёніі. Ён асуджаны на восем гадоў нібы за атрыманьне хабару. Цяпер ён працуе над сваімі дасьледаваньнямі ў калёніі, дзе яму вызначылі асобны кабінэт з камп'ютарам і доступам у Інтэрнэт.

### Выпрабаваная магутная бомба

**ЗША зладзілі выпрабаваньні самай магутнай з існуючых неатамных бомбаў МОАВ — Massive Ordnance Air Blast.** Аднак у прастамоўі яе ўжо перазвалі ў Mother of All Bombs, то бок у матухну ўсіх бомбаў. Яна важыць 9450 кг — на 40% болей за BLU-82, якімі бамбілі пячорны комплекс Тора-Бора ў Аўганістане. Мінімальная бясьпечная вышыня для скідваньня BLU-82 — 1,8 км. Можна ўявіць сабе, якую магутнасьць мае МОАВ.

### Самаспаленьне ў Празе

**19-гадовы хлапец абліўся бэнзынам і спаліў сябе на Вацлаўскім пляцы.** У развітальным лісьце, апублікаваным у Інтэрнэце, ён назваў сябе «чарговай ахвярай т.зв. дэмакратычнай сыстэмы». Юнак зьвінавáціў сучаснае грамадзтва ў абыякавасьці, у тым, што «нікому ні да кога няма клопату». Апошні час ім цікавілася паліцыя: хлопец быў зьвязаны з даркерамі, якія шукаюць моцных уражаньняў, выкліканых замыканьні на высакавольтных лініях.

### Не знайшлі супольнай мовы

**Праект «Уліс» прадугледжваў сумесную ахову паўднёвых марскіх межаў Эўразьвязу краінамі-хаўрусьніцамі.** Але ён праваліўся. За тыдзень патруляваньня ў Міжземным моры эўрапейцы не затрымалі ніводнага карабля зь нелегальнымі мігрантамі. Тады як каля 300 «гасьцёў» з Паўночнае Афрыкі зьявіліся ў Гішпаніі. Памежнікі з розных краінаў не змаглі паразумецца ды скаардынаваць дзеяньні — кожны экіпаж гаварыў сваёй мовай.

### Адэкалён замест гарэлкі

**Улады Ўдмурціі хочуць увесьці акцыз на адэкалён, бо людзі п'юць яго ахвотней за дарагую гарэлку.** І мясцовыя вытворцы алькаголю церпяць страты. Вытворцы ж парфумы нават пачалі фасаваць яе ў бутэлечкі з шырокім горлам, каб зручней было «спажываць». Улада разумее, што ўвядзеньнем акцызу наўрад ці спыніш хваробы ды сьмерці, выкліканыя такім піцьцём. Але прынамсі рэгіёну будзе эканамічная выгада.

# Дзень жанчыны

**У Парыжы прайшла маніфэстацыя пратэсту супраць сэксуальнае эксплюатацыі жанчынаў, у Бразыліі ўспаміналі сьвятую пакутніцу, заступніцу зьняважаных жанчынаў... 8 сакавіка ў сьвеце: агляд.**



Па вуліцах Каракасу 8 сакавіка шпацыравала прыгожая гвардыя Уга Чавэса

Супраць расізму, сэксізму і гвалту былі скіраваныя дэманстрацыі ў **Францыі**. «Мы, дзяўчаты з рабочых раёнаў, змагаемся проста за выжываньне», — кажа Каіна Бэнцыянэ, чыю сястру ў мінулым кастрычніку жыўцом спаліла банда падлеткаў. З удзельніцамі парыскае маніфэстацыі сустрэўся прэм'ер-міністар Францыі. Урад тае краіны 8 сакавіка прысьвяціў экс-кандыдатцы на пост прэзыдэнта Калюмбіі Інгрыд Бэтанкур, якая ўжо болей за год зьяўляецца закладніцай Рэвалюцыйных узброеных сілаў Калюмбіі.

У **Гішпаніі** апазыцыя зьвярнула асаблівую ўвагу на праблему жанчынаў — ахвяраў хатняга гвалту. Болей за 4000 чалавек прынялі ўдзел у штогадовай маніфэстацыі ў цэнтры **Барсэлёны**, патрабуючы роўнасьці правоў жанчынаў у грамадзтве, хоць па колькасьці першае месца сёлета ўпэўнена займалі транспаранты супраць вайны ў Іраку. А пачалася маніфэстацыя ўзьняцьцем транспаранту, на якім можна было прачытаць: «Лепшы сьвет магчымы, калі бачныя правы жанчыны».

Жанчыны **Бэльгіі** абвясьцілі, што яны, хоць і маюць лепшы сярэдні ўзровень адукацыі, чым мужчыны, зарабляюць на 11% менш. Хоць ён і большы на 5% за сярэднеэўрапейскі — усё адно крыўдна.

Дрэннае абыходжаньне вымусіла пратэставаць жанчынаў **Расеі.** Кожныя сорак хвілінаў з прычыны хатняга гвалту там гіне адна жанчына, а цягам году ахвярамі мужоў і сваякоў робіцца каля трыццаці шасьці тысяч.

Пад напамінамі-заклікамі «Дайце міру шанец!» і «Даніну павагі жанчынам — ахвярам вайны!» прайшло 8 сакавіка ў **Парагваі** й **Балівіі**. У **Аргентыне** 57% выбарцаў — жанчыны. І ўрад з нагоды 8 сакавіка гарантаваў жанчынам доступ як мінімум да 33% кіроўных пасадаў.

Голас жанчынаў **Афрыкі** загучаў у сэнэгальскай сталіцы Дакары. Больш за 136 млн. жанчынаў у сьвеце псыхічна альбо фізычна скалечаныя сэксуальнымі дамаганьнямі. Гэта, разам зь беднасьцю, зьяўляецца адной з найвастрэйшых праблемаў у Афрыцы. Ахвярамі жаночага абразаньня, гэтага жорсткага традыцыйнага рытуалу, становяцца амаль 40% жанчынаў у **Кеніі**. Гэта прымушае сотні дзяўчынак уцякаць з сваіх вёсак.

Калі браць пад увагу ўсе праблемы, зь якімі сутыкаюцца жанчыны сьвету, можна зразумець маленькі жанчынаў зь мясцовасьці Рэрыютаба, што ў **Бразыліі**. 8 сакавіка там моляцца сьвятой Ізабэлі. Яна загінула ў 1929 г. у 28 гадоў ад пабояў свайго мужа і шануецца як сьвятая пакутніца, заступніца зьняважаных. У Бразыліі, нават у заможным штаце Сан-Паўлу, 45% жанчынаў паміраюць гвалтоўнай сьмерцю.

**Падрыхтаваў**
**Аляксей Ігнатовіч**

# Раз, два, тры —

**Беларускія палітычныя ўцекачы сіляцца стварыць у Польшчы моцную эміграцыю. Яны хочуць адтуль весьці барацьбу зь менскай дыктатурай. Пакуль, аднак, змагаюцца між сабой.**



Сябра «Зубра» Антон калісьці паліў каля беларускай амбасады ў Варшаве здымак знаёмага чалавека ў нямецкай касцы.

Залатазубы, у чорных акулярах Валеры Грыцук (Рэмба дый годзе) стаў перад мной, як прывід. Мы не дамаўляліся пра сустрэчу. Я нават не падазраваў пра ягонае існаваньне. Нечаканы госьць выглядаў кілерам з кічаватага фільму пра гангстэраў. На шчасьце, замест пісталета ён наставіў на мяне чатыры аркушы паперы.

Пад тэкстам я ўбачыў подпіс «Др. Валеры Грыцук — беларускі палітык на эміграцыі». І ўсё. Доктар Валеры не зьбіраўся нічога тлумачыць. Ён палічыў, што пары красамоўных поглядаў дастаткова. Нібыта мы былі шмат гадоў знаёмыя і належалі да аднаго клюбу выдатна праінфармаваных і высакародных джэнтэльмэнаў.

Грыцук недвухсэнсоўна намякаў, што я мушу дапамагчы яму апублікаваць тэкст пра стан беларускай апазыцыі. У імя агульных інтарэсаў і на злосьць дыктатарскаму рэжыму. Дзеля наданьня сваім словам вагі, доктар прадставіўся як дэпутат і адзін з лідэраў БНФ у мінулым, а цяпер самастойны дзяржаўны дзяяч, які мае намер схіліць польскія ўлады да супрацоўніцтва, а пасьля, магчыма, інсьпіраваць беларускія паседжаньні «круглага стала». Адным словам — цудатворца. На разьвітаньне яшчэ раз блiснуў залатымі зубамі й зьнік.

## Брусэль поўны агентаў

У Менску папулярны такі жарт: «Як выехаць зь Беларусі? Трэба памахаць на вуліцы бел-чырвона-белым сьцягам, каб цябе схапілі. Адседзеўшы пару гадзінаў у пастарунку, можна падавацца на Захад, галасна скардзячыся на палітычны перасьлед».

— Няма чаго дзівіцца, — кажа Зянон Пазьняк, заснавальнік і кіраўнік БНФ. — Згадайце, колькі палякаў уцякло з Польшчы, прыкрываючыся шыльдаю «Салідарнасьці». У большасьці гэта былі эканамічныя эмігранты, як і беларусы, што цяпер бягуць ад Лукашэнкі. Адно што асяродак беларускай эміграцыі да мозгу костак пранізаны расейскай агентурай. КДБ выкарыстаў старыя фронтаўскія структуры, каб перакінуць сваіх людзей на Захад. У Брусэлі аж у вачах мітусіцца ад расейскіх агентаў, што маскіруюцца пад апазыцыянэраў зь Менску.

На пытаньні пра беларускую эміграцыю ў Польшчы Зянон Пазьняк адказвае так:

— Яе не існуе. Апроч мяне й маёй сям'і палітычных эмігрантаў тут няма. У Польшчы ёсьць некалькі дзясяткаў беларускіх уцекачоў. Ім здаецца, што яны робяць палітыку, але гэта толькі іхная мара. Сярод іх — бізнэсоўцы, якіх перасьледаваў Лукашэнка, журналісты, якіх напужалі спэцслужбы, а таксама некалькі хлопцаў, якія на мітынгу атрымалі дручком па карку й думаюць, што адразу сталі палітыкамі.

## Забралі б нават без нагі

Калі я першы раз спаткаў Антона, ён быў у камуфляжы й зялёным капелюшы амэрыканскай марской пяхоты, на сьпіне боўтаўся салдацкі заплечнік. Хіба так выглядаюць тыя, хто «косіць» ад войска? Між тым, прызыву 20-гадовы Антон баіцца больш, чым турмы.

— У нашым войску надзіва многа самагубстваў, — кажа ён. Антон мае на сваім рахунку 25 дзён арышту, двойчы яго моцна зьбівалі за антыпрэзыдэнцкую дзейнасьць. Выйшаўшы з больніцы, хлапец панёс скаргу ў міліцыю. Гэта была памылка. У адказ атрымаў выклік на прызыўную камісію.

— Мяне раней прызналі непрыдатным да службы, — апавядае Антон. — Я разумеў, што цяпер мяне возьмуць у войска, нават калі я прыйду без нагі. Знаёмы міліцыянт папярэдзіў, каб я лепш уцякаў, бо праз маё «зуброўства» ў войску жыцьця ня будзе.

Да камуфляжнае камізэлькі Антона зьлева, дзе сэрца, прышпіленая зуброўская значка.

У Варшаве Антон адразу трапіў у лягер уцекачоў. «Там цяжкая атмасфэра, людзі робяцца вар'ятамі ад бязьдзейнасьці», — кажа ён. Праз месяц знайшоў працу. За 50 злотых у дзень разносіў рэклямныя ўлёткі па варшаўскіх ускраінах. Здымае кватэру пад Варшавай. На «палітыку» ня мае часу. Працуе з раньня да вечару, а ўначы сьніцца яму рэклама на ўлётках.

Антон скончыў мастацкі ліцэй і жадае вывучаць жывапіс. Але з часу прыезду ў Польшчу ўвогуле не малюе, чакае лепшых часоў. Ён запісаўся ў Саюз беларускіх палітычных уцекачоў, але ня зьвязвае з гэтым вялікіх надзеяў.

## Я ня ведаў, што гэта бандыт

Валеры Кругавы, адзін з заснавальнікаў таго Саюзу, ніколі ня думаў, што будзе ўласнымі рукамі будаваць лецішчы й абсталёўваць дзіцячыя пляцоўкі. Раней ён ня меў нічога супольнага з цясьлярствам. Валеры — кандыдат эканамічных навук. Некалі адкрыў банк і інвэстыцыйны фонд, які з часам сабраў 70 тысяч акцыянэраў. Ён быў дырэктарам Беларускай біржы каштоўных папераў. Калі да ўлады прыйшоў Лукашэнка, першымі «пад раздачу» трапілі прыватныя прадпрымальнікі. Кругавы, які адкрыта выступіў супраць новага прэзыдэнта, спачатку страціў інвэстыцыйны фонд, пасьля мусіў закрыць фірму і ўрэшце быў зьвінавачаны ў падробцы вэксаляў на паўмільёна даляраў. У лютым 1998 г. ён зьбег у Польшчу. Кажа, што здолеў выехаць акурат перад арыштам.

Кругавы — былы дэпутат Вярхоўнага Савету і ў свой час таксама быў прыхільнікам Лукашэнкі. «Мала таго, што сам за яго галасаваў, дык яшчэ пазычаў яму ўласную машыну, якою ён езьдзіў на мітынгі. Я ж ня ведаў, які ён крcủель. Я заняўся палітыкай, бо краінаю кіравалі зладзеі з постсавецкай намэнклятуры. Бізнэсоўцы мусілі ім плаціць, як мафіі. Гэта трэ было спыніць. Лукашэнка мусіў перамагчы камуністаў. Ніхто тады ня думаў, што недавук-дырэктар саўгасу з-пад Магілёва прыбярэ да рук цэлую дзяржаву. Віктар Ганчар пераконваў мяне, што Лукашэнка навядзе парадак, а пасьля стырно пяроймуць прафэсіяналы. Тым часам новы прэзыдэнт разабраўся ня толькі з камуністамі, але з усімі, у тым ліку і з Ганчаром. Месцы зладзеяў занялі бандыты».

Сям'я Валер'я Кругавога вярнулася ў Менск. Пасьля разводу ён застаўся ў Польшчы адзін. Грошы, прывезеныя зь Беларусі, даўно скончыліся. У яго дагэтуль ёсьць мноства акцыяў беларускіх прадпрыемстваў, але гэтыя паперы нічога не каштуюць. Ён зарабляе на жыцьцё будаўніцтвам драўляных дамкоў. І ўжо амаль год Кругавы займаецца справай яднаньня беларускай палітычнай эміграцыі ў Польшчы.

— Мы сілай у Саюз нікога ня цягнем. Кожны кандыдат пільна правяраецца. Пакуль нас каля тысячы.

## Заўтра цябе арыштуюць

Аб'яднаць эміграцыю хоча і Аляксей Дзікавіцкі, малады журналіст радыё «Свабода», раней — рэдактар пінскай рэгіянальнай газэты. Аляксей падтрымлівае сувязі з Саюзам беларускіх палітычных уцекачоў, але хоча распачаць і ўласную справу. У ім бурліць энэргія, у яго па сто ідэяў адразу. Па-першае, ён зьбіраецца зарэгістраваць у Польшчы беларускую няўрадавую арганізацыю — нешта накшталт вялікага інфармацыйнага цэнтру, які будзе выдаваць бюлетэнь і публікаваць навіны зь Беларусі. Дадаткова Дзікавіцкі плянуе стварыць выданьне, якое ён будзе рэдагаваць у Польшчы, а пасьля «перапраўляць» у Беларусь. Яго не хвалюе, што Саюз беларускіх палітычных уцекачоў пачаў выдаваць таненькую газэтку «Эмігрант». Аляксей пэўны, што ягоная газэта мусіць пісаць пра перавагі рынкавай эканомікі й тлумачыць беларусам прынцыпы дэмакратыі.

— Без адукацыі нічога не даб'ёмся, — тлумачыць Дзікавіцкі. — Нашыя людзі ня ведаюць, што ўрад жыве за іх кошт, што трэба яго кантраляваць і што яго можна зьмяняць. Грамадзянскай сьвядомасьці ў беларусаў няма ніякай. Грамадзтва не разумее сутнасьці выбарнай улады. У нас апазыцыйную дзейнасьць трэба пачынаць з адукацыі. Першыя дэмакраты ўсталёўвалі новую сыстэму сілаю і таму прайгралі.

У 2001 г. Аляксей Дзікавіцкі настроіў супраць сябе ўладу, выкрываючы ў сваёй газэце перадвыбарныя парушэньні. Яму інкрымінавалі паклёп на дзяржаўную ўладу. Знаёмы з пракуратуры патэлефанаваў і папярэдзіў, што заўтра Аляксея арыштуюць. Дзікавіцкі за некалькі гадзінаў сабраўся і разам зь «сьпіртавозамі» прыехаў у Польшчу. Ён кажа, што з-за мяжы можа лепш паслужыць справе змаганьня з дыктатарам, чым з-за кратаў ва ўласнай краіне.

## Яны вельмі разьяднаныя

Пра гісторыю беларускай палітычнай эміграцыі я даведаўся каля



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Пазьняк кажа, што акрамя яго і ягонай сям'і палітуцекачоў у Польшчы няма.

# яднаеш ты

беларускай мяжы, за сорак кілямэтраў на ўсход ад Беластоку, у Крынках, пад яблыняю на сядзібе Сакрата Яновіча.

— У царскай Расеі, праз слабасьць нацыянальнага руху, не было канфлікту з уладамі й не было эміграцыі, — распавядае самы вядомы беларускі пісьменьнік Польшчы. — Толькі ў міжваеннае дваццацігодзьдзе рушыла першая хваля палітычных уцекачоў. Гэта былі інтэлігенты, зьвязаныя з створаным у сакавіку 1918 г. урадам незалежнай Беларусі. Яны мусілі ўцякаць і ад палякаў, і ад саветаў. Спачатку ў Коўна, пасьля ў Прагу, куды пераехаў эміграцыйны ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі. Думаю, што тады выехала ня больш за трыста асобаў. Другая эміграцыйная хваля была ўжо плябейскаю й масавай. Пад канец другой сусьветнай вайны, калі адыходзілі немцы, за імі беглі беларускія сем'і. Трэба памятаць, што шмат хто спачатку вітаў немцаў як вызваліцеляў. Пасьля вайны беларусы, якія супрацоўнічалі зь немцамі, уцякалі ад бальшавікоў у ангельскую й амэрыканскую зоны акупацыі. Большасьць (прыблізна каля 20 тыс.) выправілася пасьля ў Злучаныя Штаты. Там быў адноўлены праскі эміграцыйны ўрад, але ўтварыць моцныя грамадзкія структуры ня здолелі. Не хапала адукаваных людзей і прытоку сьвежай крыві. Цяпер, калі рушыла трэцяя, лукашэнкаўская хваля эмігрантаў, яна ня знойдзе апірышча ў ранейшых уцекачах. Па-першае, тыя ўжо выміраюць, па-другое, новая эміграцыя амаль выключна інтэлігенцкая. З аднаго боку — мужык, які ўсё жыцьцё прастаяў пры канвэеры Форда і дагэтуль не размаўляе па-ангельску, зь іншага — малады студэнт, што ведае некалькі замежных моваў. Адны грэбуюць другімі. Таму тыя, якіх «выкінуў» Лукашэнка, будуць спрабаваць аб'яднацца самі.




**Валеры Кругавы — расеец, які не размаўляе па-беларуску, але хоча аб'яднаць беларускіх палітуцекачоў.**

Працяг гэтай гісторыі распавёў мне Яўген Вапа, кіраўнік Беларускага саюзу ў Польшчы:

— Сапраўдных палітычных эмігрантаў няшмат. Да таго ж яны вельмі разьяднаныя. Яны прыяжджаюць сюды, пабітыя на разнастайныя фракцыі ды згуртаваньні. Шмат сярод іх бізнэсоўцаў, якія ў палітыку трапілі выпадкова. Яны ўцякалі ад рэжыму Лукашэнкі й сталіся апазыцыянэрамі супраць уласнай волі. А палітыку яны бачаць праз прызму сваёй фірмы. Ня так, як фронтаўцы кшталту Пазьняка, і зусім адрозна ад маладых адчаюгаў, якія на мітынгах у Менску кідалі камяні ў міліцыю. Зьява эміграцыі выкліканая рэчаіснасьцю, у якой немагчыма самарэалізавацца. Тыя, хто ўцякае ды з адлегласьці хоча зьмяніць сытуацыю, асуджаныя на спробы аб'яднаньня. Але ёсьць жа тыя, хто не эмігруе, а адседжвае чарговыя тэрміны, змагаецца з рэчаіснасьцю, трываючы наступствы свайго выбару.

## Праз два дні Лукашэнкі ня будзе

Мужчына матляе над міліцэйскімі каскамі акрываўленай кашуляй, хтосьці, уцякаючы ад «паляваньня», заскоквае ў раку; побач людзі ў цывільным зьбіваюць з ног старую жанчыну; падлеткі кідаюцца ў міліцыянтаў тратуарнай пліткай; інтэлігентны спадар у чорным плашчы лупцуе парасонам двух у мундзірах, якія выкручваюць рукі дзяўчыне; руплівы функцыянэр вырваў у кагосьці бел-чырвона-белы сьцяг і спрабуе зламаць дрэўка аб калена, праз хвіліну на яго абвальваецца лес ананімных рук; перад міліцэйскім шыхтом стаіць самотная жанчына, так блізка, што амаль прылепліваецца да мэталічнага шчыта, і праз плястык каскі глядзіць у вочы маладому міліцыянту. На экране тэлевізара хутка зьмяняюцца чарговыя постаці.

Ян Абадоўскі, старшыня Саюзу беларускіх палітычных уцекачоў у Польшчы, запрасіў на трохгадзінны сэанс — уласную хроніку парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі. Ягоны бацька — вядомы магілёўскі праваабаронца. Ян быў адным з заснавальнікаў «Маладога фронту». Улады абвінавацілі яго ў арганізацыі недазволеных дэманстрацый. Бацька сам прыехаў зь ім у Польшчу й дапамог навязаць першыя кантакты. Празь некаторы час Ян перацягнуў да сябе беларускую нявесту. Цяпер абое яны займаюцца маркетынгам у адной з польскіх фірмаў. Вучацца. Здымаюць кватэру ў ціхім раёне Беластоку. Хваляць Польшчу, але запэўніваюць, што вернуцца ў Беларусь, ледзьве зьгіне дыктатура. Ян увесь вольны час прысьвячае Саюзу.

Гледзячы запісы мітынгаў, Абадоўскі зь цяжкасьцю стрымліваецца. Відаць, зь якой ахвотай ён скочыў бы ў тэлевізар і, размахваючы сьцягам, выйшаў у першы шэраг. На экране некаторыя сцэны паўтараюцца. Асабліва часта паказваюць жанчыну з акрываўленым тварам, якая са сьлязьмі ў вачах кажа ў камэру: «Я не баюся дубінак. Я не баюся сьмерці. Жыве вольная Беларусь!» Гаспадар трыюмфуе:

— Сто тысячаў такіх, і праз два дні Лукашэнкі ня будзе! Менавіта гэта нам трэба!

Абадоўскі выкрыквае гэтыя лёзунгі з камфортнай эміграцыйнай канапы. Побач ладненькая нявеста чытае бэстсэлер Джона Грэя «Мужчыны з Марсу, жанчыны з Вэнэры».

## Я б не хацеў казаць пра гэта

Гонар Абадоўскага — «Эмігрант», малатыражны штомесячнік, які выходзіць з красавіка мінулага году. Ён лічыць, што гэтае выданьне аб'ядноае беларускую апазыцыю вакол «супольнай справы». Ян Абадоўскі кажа, што гатовы супрацоўнічаць з кожным і што для яго ня маюць значэньня палітычныя погляды. Што гатовы размаўляць і зь левымі, і з правымі.

— А зь Зянонам Пазьняком?

Пасьля доўгай паўзы Абадоўскі адказвае:

— Гэта вялікая праблема. Пазьняк лічыць, што большасьць апазыцыянэраў працуе на КДБ. Але гэта несур'ёзна. Некалі мы сустракаліся, але цяпер ня маем кантактаў. Я б не хацеў пра гэта размаўляць. Спадзяюся толькі, што ён будзе супрацоўнічаць з нашым Саюзам.

Зянон Пазьняк:

— Саюз стварылі несур'ёзныя людзі. Хлопцы, якія лічаць сябе вялікімі палітыкамі, але дзейнасьць іх абмяжоўваецца выданьнем прымітыўнай газэты. Я іх не асуджаю. Наадварот, мне вельмі прыемна, што яны арганізуюцца, спрабуюць нешта рабіць. Гэта для іх добрая школа. Але яны ніколі ня стануць палітычнай сілай. Дастаткова паглядзець, хто ўваходзіць у гэты Саюз. Лепш было б, каб людзі, замест гульні ў палітыкаў, заняліся сваімі справамі: моладзь — адукацыяй, бізнэсоўцы — бізнэсам, журналісты — навінамі.

Аляксей Дзікавіцкі:

— У Беларусі павінна адрадзіцца апазыцыя. Старыя структуры ўжо неэфэктыўныя, а спробы іх рэанімаваць ня маюць сэнсу. Новая хваля беларускага супраціву павінна прыйсьці з правінцыі. Мая газэта будзе дасягаць малых мястэчак і вёсак. Там ёсьць людзі, што створаць новую палітычную сілу. Я пляную заснаваць у Польшчы калёнію для дзяцей беларускіх апазыцыянэраў. З часам, можа, удасца арганізаваць дапамогу сем'ям тых, каго перасьледуюць. Я б хацеў, каб дзейнічала сыстэма накшталт «Салідарнасьці», каб сем'і вязьняў не заставаліся бяз сродкаў да існаваньня. Трэба ўзьняць прэстыж апазыцыі ў Беларусі й пабудаваць моцны антылукашэнкаўскі лягер.




**Некаторыя беларусы і ў Польшчы баяцца «рукі КДБ». Зь вітрыны варшаўскай кнігарні за мінакамі сочаць Бэрыя і Мао.**

Валеры Кругавы:

— Спробы ўплываць адсюль на апазыцыю ў Беларусі бессэнсоўныя, бо яна ня мае там ніякага ўплыву. Яна бясьсільная. Пакуль можна толькі марыць пра адзіны фронт апазыцыі, падтрыманы эміграцыяй. Гэта як калі б вы хацелі аб'яднаць два злотыя з трыма злотымі. Інвэстыцыйнага капіталу не атрымаецца. Я працую ў Саюзе, каб стварыць арганізацыю, якая будзе дапамагаць беларускім эмігрантам. Каб думаць пра палітыку, спачатку мы самі мусім стаць на ногі. Каб дасягнуць гэтай мэты, варта яднацца.

Ананімны суразмоўца:

— Кругавы — расеец. Не размаўляе па-беларуску й нават не спрабуе вучыць нашу мову. От параноя была б, калі б ён нас яднаў!

## Гэтай апазыцыяй кіруюць з Масквы

Другі раз маладога «зубра» Антона я спаткаў праз чатыры месяцы. Ён зьмяніўся. Пастрыг доўгія валасы, ад вайсковай вопраткі засталася толькі камізэлька, да якой ён прышпіляе сваю значку. Усьмешлівы, свабодны, ён абсалютна ня быў падобны на чалавека, што праседзеў апошнія два дні пад арыштам. У жыцьці Антося адбыліся зьмены. Ён атрымаў стыпэндыю ў адной з прыватных вышэйшых навучальных установаў і пакой у інтэрнаце. Без асаблівага жалю Антось адкінуў мары пра жывапіс і вывучае кіраваньне й маркетынг. Калі ён распавядае пра гэта, на ягоным твары квітнее ўсьмешка чалавека, які выйграў у лятарэю. У ім адчуваецца новая энэргія. Ён ужо не разносіць столькі рэклямы, як некалі. Затое шмат часу прысьвячае «дзейнасьці», г.зн., у ягоным выпадку, — палітычным графіці. Менавіта калі ён маляваў антылукашэнкаўскія надпісы на сьценах Варшаўскага ўнівэрсытэту, яго схапіла паліцыя. Адседзеў два дні й заплаціў штраф. Калі б Антось быў палякам, яго б нават не арыштавалі. Але ён не пераймаецца. Наадварот — выглядае задаволеным. Можа, нават цішком ганарыцца дадатковым апазыцыйным досьведам.

Акцыі «Зубра» ў Беларусі досыць гучныя. І чым большы розгалас ад іх, тым больш горкіх словаў чуваць на адрас «Зубра». Сярод беларускай палітычнай эміграцыі пануе перакананьне, што «Зубр» — вялікае ашуканства, створанае для таго, каб выцягнуць грошы з Захаду. Палітычныя эмігранты рытарычна пытаюцца: «Дзе тыя грошы? Хіба ўсё пайшло на вопратку для некалькіх дзясяткаў хлопцаў і друк пары плякатаў?»

Сваю тэорыю на тэму «Зубра» мае Зянон Пазьняк:

— Гэта жудасная рэч. Гэтых маладых людзей трэба ратаваць. Яны ня ведаюць, што імі кіруе агентура КДБ, якая нацкоўвае хлопцаў на Лукашэнку і адначасова русіфікуе. Там ня вучаць паважаць нацыянальны сьцяг. Там сьмяюцца зь беларускага патрыятызму…

— Лухта! — Антон з запалам бароніць сваю арганізацыю. — У «Зубры» прысягаюць на бел-чырвона-белым сьцягу і вучаць беларускую мову. А грошы атрымліваем, бо працуем. Цікава, чаму гэтыя быццам заслужаныя апазыцыянэры не атрымліваюць грантаў? Бо яны дупы адседжваюць і марудзяць. Яны здольныя толькі сварыцца міжсобку. Найлепшым прыкладам ёсьць сам Пазьняк. Некалі ён быў вялікім лідэрам, а цяпер ніхто. Замест таго каб быць нацыянальным правадыром, ён уцёк і разьмяняў свой палітычны капітал на дробязі. Старая беларуская апазыцыя скампрамэтавала сябе дарэшты. Таму мы паспрабуем змагацца самі.

## Эпілёг

Артыкул, што ўручыў мне залатазубы доктар Валеры Грыцук, гэткі ж загадкавы, як сам аўтар. У тэксьце немагчыма знайсьці ні тэзы, ні высноваў. Апроч пэцканьня брудам першых лідэраў БНФ, называньня Лукашэнкі «бараном-правакатарам» і ні з пушчы ні з поля прадказаньня беларускіх «круглых сталоў», там няма нічога. Літаральна нічога. Але гэты тэкст прасякнуты дзіўнай сілай. Сілай, якая не дазваляе ігнараваць справы таямнічага «палітыка». Між радкоў гэтага незвычайна вялікага твору крыецца праўда пра беларускую палітычную эміграцыю. Яна знаходзіцца ў такім самым выглядзе, як тэкст Грыцука: яна ёсьць, але нібыта й няма яе.

**Аркадыюш Бартосяк, «Czasopis», Беласток**



# Žyvaja mova

**Nabližajecca źjezd biełaruskaj intelihiencyji. Cikava, ci zrobić jon jakijaś zachady ŭ abaronu žyvoj biełaruskaj movy?** «Ну вот, опять эта мова, — skaža jinšy intelihient. — Надоело! Интеллигенция только и делает, что абараняе мову». A kamu ž, jak nie intelihiencyji, abaraniać movu? Chto ž jinšy zmoža taktoŭna i mudra danieści da astatnich płastoŭ nacyji važnaść hetaj ideji? Intelihiencyja lubić pleścisia ŭ farvatery čužych idej ci zajavaŭ adzinaha palityka. Usio čakaje, kali demakratyčny prezydent ukazam dazvolić movu. Čamu b nie pierachapić inicyjatyvu? Što zaminaje nam samim całym źjezdam pryniać, skažam, takuju aryhinalnuju rezalucyju: *«Biełaruskim intelihientam źjaŭlajecca tolki toj intelihient, chto zaŭsiody i paŭsul razmaŭlaje pa-biełarusku. Chto ž źniščaje rodnuju movu* (bo kali razmaŭlaješ pa-rasiejsku, dyk heta značyć, što pa-biełarusku ŭ hety momant nie razmaŭlaješ, a heta ŭ svaju čarhu značyć, što rodnuju movu źniščaješ), *toj nia maje prava nazyvacca intelihientam*».

Lišni raz padkreślu: *biełaruskim.* Intelihientnaść nie vyznačajecca movaju. Ale *jość dva* absalutna roznyja typy intelihientaŭ. Intelihient pieršaha typu razmaŭlaje ŭ siamji, na pracy pa-biełarusku. Tvorčaść jaho skiravanaja na Biełaruś (niezaležna ad taho, ci jon daśleduje rodny arnament, ci maluje abstraktnyja trochkutniki). Takoha intelihienta inačaj jak biełaruskim nazvać niemahčyma. Intelihient druhoha typu całkam u śviecie rasiejskaj kultury i movy. Ź niečym biełaruskim jaho łučyć tolki biełaruskaja kroŭ u žyłach, miascovaja prapiska i глубочайшее убеждение, что Короткевича нужно читать только в оригинале. Ja maju spadzieŭ, što ŭ takich intelihientaŭ chopić intelektu i sumleńnia nie adbirać u nas našaha imia.

Ja prapanavaŭ takuju farmuloŭku rezalucyji nia dzielia taho, kab padzialać blizkich ludziej na roznyja płyni. My musim supracoŭničać. Važna, kab narod mieŭ jasna akreślenyja aryjenciry, polusy. Bo hramadztva dezaryjentavanaje i «praśpić jano jasnu zaru».Vydajecca šmat knih, pra jakija ŭ savieckija časy my mahli tolki maryć. Ale knihi, dyktary, nastaŭnicy biełaruskaj movy i litaratury — usio heta miortvaja mova. Zafiksavanaja ŭ litarach ci vymaŭlenaja «zhodna z służbovymi abaviazkami». Što da žyvoj, hutarkovaj movy, dyk tut my hublajem pazycyji. A mienavita hetaja mova štodnia śviedčyć, što my žyviom jak nacyja, što my adčuvajem plačo adzin adnaho, što my salidarnyja, što my pratestujem. I vysiłkaŭ patrabujecca mizer: usiaho tolki havary pa-biełarusku — i budzie žyć Biełaruś. Takaja rezalucyja nadała b impuls našaj intelihiencyi. Dziejničać treba ciapier, nie čakajučy «prymusovaj» biełarusizacyji. Bo kali załunaje naš ściah nad Domam uradu, tady luby durań zahavoryć pa-biełarusku. Tady lubaja pradavačka spytaje, jak pytała ŭ pačatku 90-ch: «Счас вы все заразмаўлялі, а гдзе ж вы былі да 19 аўгуста?»

Dyk dzie my — sumleńnie nacyji? A raptam zaŭtra hrymnie «19 аўгуста»?

**Henik Łojka, Miensk**

**АД РЭДАКЦЫІ.** Друкуючы прапанову мастака Г.Лойкі, Рэдакцыя лічыць патрэбным зрабіць наступную заўвагу. Мова яднае беларусаў. Кожны беларус любіць яе і жадае яе адраджэньня. Таму разьдзяляльныя лініі па моўнай прыкмеце маюць вялікую ступень умоўнасьці і мала практычнага сэнсу. Мову трэба не абараняць, ёю трэба проста карыстацца і змушаць дзяржаву да яе выкарыстаньня. Рэзалюцыямі тут рады не дасі.

МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ

# Я — сьведка фальсыфікацый

**Быў я назіральнікам на гэтых выбарах.**

Да выбараў мы абыходзілі ўсю акругу, званілі ў кожную кватэру, раздавалі ўлёткі за БНФ. Часта людзі казалі нам словы ўдзячнасьці. Гаварылі «Памагай вам Бог» і г.д. Калі ж я патэлефанаваў «беспартыйнаму» кандыдату, які «выйграў» у нашай акрузе, ён мне паведаміў, што за яго прагаласавала 73% выбаршчыкаў. Адчуваеце? «Элегантная перамога»! Гэты чалавек не праводзіў ніякай агітацыі.

Мяркуючы па стосах бюлетэняў, на маім участку №… …-й акругі Кастрычніцкага раёну перамагала кандыдатка ад сацыял-дэмакратаў. «Беспартыйны» набраў трохі меней. Але ў пратакол запісалі за «беспартыйнага» 646, за сацыял-дэмакратку — 203 галасы.

У пратаколы старшыні пісалі тыя лічбы, якія ім загадалі. На ўсіх участках паводзіны камісіяў былі аднолькавыя. Любы назіральнік вам пацьвердзіць, што выбары сфальсыфікаваныя, і ўлада нават не хавала гэтага. На меркаваньні народу ўладзе пляваць!

**Алесь Радына, Менск**

**АД РЭДАКЦЫІ.** Нумары ўчастку і акругі, а таксама кантакты аўтара маюцца ў Рэдакцыі. Калі ў сталіцы ёсьць хоць адзін сьмелы пракурор, калі ласка, хай бярэцца й разьбіраецца.

# Разгул квісьлінгаў

**Квісьлінг — кіраўнік Нарвэгіі, які здаў сваю краіну Гітлеру. Чытаючы допісы ў «НН», хапаешся за галаву — няўжо ў нас так шмат гэткіх квісьлінгаў?** Усё пачалося з апытаньня пра стаўленьне да вайны ў Іраку. Ляйтматывам шмат якіх адказаў было: мы жадаем адхіленьня дыктатара, бо ў нас таксама дыктатар! А «сувэрэнітэт», «унутраныя справы» — гэта для спадарства пустыя словы? Якое права мае чужая краіна вырашаць, што нейкай дзяржаве не падыходзіць яе кіраўнік? Аргумэнт «Гэта ж вайна ня супраць народу» не спрацоўвае. «Адхіляючы» Мілошавіча, разбамбілі ўсю дзяржаву.

Узгадайма дыпляматычныя нормы: калі закранаецца адзін амбасадар, заканутай лічыцца ўся дзяржава. Калі б у нас суд даў якомусь амбасадару «вышку», ці прыняла б яго радзіма тлумачэньні: «Мы ж ня супраць вашай краіны, мы супраць гэтага чалавека»? Той, хто хоча ўвесьці ва ўнутрыпалітычную барацьбу чужынца, — здраднік, квісьлінг. Калі народ пакутуе пад прыгнётам невялікай групоўкі, ня грэх яму дапамагчы. Але мусіць быць відавочная ўласная ініцыятыва гэтага народу. Інакш выходзіць умяшаньне ва ўнутраныя справы на баку той ці іншай палітычнай сілы.

Лукашэнка не выконвае міжнародных пагадненьняў, дэклярацый. Але ніхто не абавязвае яго да гэтых пагадненьняў — ён сам імі даражыць. І паўтараць народу: «Лукашэнка дрэнны для Беларусі, бо парушае эўрапейскія пагадненьні» — тое самае, што прызнаваць наднацыянальныя парадкі найвышэйшым законам для Беларусі. Выглядае як падпарадкаваньне хоць і братам-эўрапейцам, але ўсё-такі замежнікам.

**Віталь Станішэўскі, Менск**

# Сваё вышэй за чужое

**У «НН» ад 14 лютага 2003 г. артыкул сп.Лявона Вольскага напісаны з добрай думкай і цікава.** Беларусы яшчэ ня выраблі паводзін да чужынца і да чужое мовы, каб сваё ставіць вышэй за чужое. Я адчуў гэта, як быў у Канадзе, дзе францускамоўныя нічога не адказваюць, калі да іх зьвяртаешся на ангельскай мове. У 1991 г. я быў у Менску ў рэстарацыі. І калі афіцыянт не зразумеў мяне па-беларуску, ён прыслаў іншага, каторы абслужыў па-беларуску.

Я ня ўмею па-расейску, гавару пабеларуску. І шмат хто разумеў мяне, ня трэба было тлумача. Хай дзяржаўныя ўстановы, бізнэс і школа прыйдуць на беларускую мову — ажывае наша мова. У Беларусі савецкія назовы і савецкі дзяржаўны сьцяг. Вось чалавек і адчуваецца як у чужой краіне, дый чужая мова скрозь чуваць.

**Кастусь Верабей, Нью-Ёрк**

8 САКАВІКА

# Жанчына — лічба

**Вясна пачынаецца 8 сакавіка. Пасьля лютага лютаўскага сьвята абаронцаў шмат у якіх галовах яшчэ не адгрымелі гарматы й не прарыпелі тармазы, таму на выбары галовы гэтыя пайшлі крыху пахмельныя.** Сказана ж: кожны выбар мае быць пакутай, дык чаму ж не палекавацца загадзя — валей «пакуцьця», чым папакутваць. Не хацелася б разважаць пра полавыя адрознасьці, але стаўленьне да пакуты як такой ёсьць сапраўдны лякмусавай паперкай у гэтым сэнсе. Жанчыны мусяць цярпець і перажываць яе, мужчыны — прымаць і пераўтвараць.

Пра цярплівасьць нашых жанчын складаюцца паданьні, мужчыны ж зьбягаюць ад пакут у гарэлку й абыякавасьць. А гэта і несумленна, і нешляхетна. Таму выбар, які мы рабілі, быў ні па-жаночаму выбарам сэрца, ні выпакутаваным выбарам галавы, а ўлада, выбраная гэтак, аказваецца і бессардэчная, і, галоўнае, безгаловая. Акурат такая ўлада й прапанує нам свае ўлюбёныя лекі ад усеагульнай пакуты — сьвяты, сьвяты й сьвяты...

8 сакавіка ў іх шэрагу — сьвята адметнае, бо жаночае. Гэты дзень успрымаўся мною заўсёды як нешта лічбава-лінгвістычнае. На малечых самаробных паштоўках у падарунак роднай маці верхняя пятля васьмёркі была меншай за ніжнюю, а тая, у сваю чаргу, атрымлівалася крывенькая дзеля дрыжыкаў у акцябрацкай руцэ.

Гэтая васьмёрка й сталася для мяне з маленства сымбалем жанчыны. Жанчына — лічба, жанчына — бясконцасьць, жанчына — асымэтрыя. Таямніча-эратычны, самазамкнёны й самадастатковы знак, да якога — адно правесьці датычную і па-мужчынску прытуліцца, каб схавацца ад татальнай марнасьці й пакуты. Знак нашага лёсу.

8 сакавіка было для мяне заўсёды сьвятам інтымным: маці, каханка, жонка, а цяперака й дачушка — вось тыя цэнтры, вакол якіх ствараўся сьвяточны сусьвет. Нейкая «міжнародная» жанчына выклікала жах, калі намагаўся ўявіць яе сабе. Жаночае сьвята ёсьць сямейным сьвятам, і адно праз інтымную ўтульнасьць сям'і да нас прыходзіць разуменьне небессэнсоўнасьці тых «пакутаў выбару», якія мы церпім, бо выбіраем дзеля нашых жанчын — жонак, дачок, Радзімы. І пакуты гэтыя адухаўляюцца менавіта імі. Са сьвятам, каханыя, бо прыйшла вясна.

**Зьмітра Казакевіч, Віцебск**

ПРЫНУКА

# У БРСМ — сілком

**Зь верасьня 2002 г. у нас існуе Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Зусім нядаўна нам, студэнтам БНТУ, прапанавалі абавязкова ўступіць у гэтую няпэўную арганізацыю, г.зн. прымусова, ды яшчэ заплаціць па 1200 рублёў за ўступ.** А калі ня ўступім, то здымуць дэкана факультэту, а можа, нават яшчэ і фінансаваньне скасуюць. Вось цяпер і думаем, ці не ўступаць, памятаючы аб свабодзе выбару, ці падумаць пры дэкана (вельмі добры чалавек) і працяг вучобы і тады забыцца аб гэтай свабодзе.

У школе нас прымушалі ўступаць у БПСМ. Я тады ад злосьці ўступіла ў БСМ і нейкі час была ў гэтай арганізацыі, значна лепшай за БПСМ хоць бы сваімі кадрамі й цікавымі мерапрыемствамі. Але пасьля сканчэньня школы трэба нейк круціцца, зарабляць, бо на мізэрную стыпэндыю не пражывеш, вось таму і сышла з арганізацыі. У нас шмат студэнтаў працуе, таму хапае часу толькі на вучобу, ня кажучы пра нейкую там грамадзкую арганізацыю.

Тое, што цяпер адбываецца ў нас у БНТУ, — гэта вынік маўчаньня апазыцыйнай прэсы аб сапраўдным стане спраў з моладзевымі арганізацыямі. А менавіта ад нас, моладзі, залежыць наша будучыня, і калі ў моладзевай палітыцы нейкія праблемы, то аб гэтым трэба пісаць у першую чаргу. Нам трэба ведаць усю праўду, а ня тую хлусьню, што даецца дзяржаўнымі сродкамі інфармацыі. Я і мае ўнівэрсытэцкія сябры ня хочам ніякага прымусу, а хочам, каб мы самі вырашалі сваю будучыню.

**Наста, Менск**

ВОДГУЛЬЛЕ

# Касьцёл і «касьцёр»

**Ня так даўна журналіст радыё «Свабода» даў у «НН» вялікі артыкул пра сына, які ходзіць у расейскі садочак.** Маўляў, няма чаго ствараць рэзэрвацыю для беларусаў, хай дзіцятка засвойвае расейскую мову — нібы гадуе другую галоўку: адну для сям'і, другую для сьвету. Ёсьць чым хваліцца. Ды пра нешта забыўся «свабодны» журналіст. Як колькі гадоў таму ў цэнтры Менску стваралі беларускі садочак. Як складаліся сьпісы малечы (з паўсотні прозьвішчаў ды — ах, якіх! — імёнаў). Як падаваліся тыя сьпісы ў РАА... І як ледзь ня быў расфармаваны той садок. Не, не праз злосных чыноўнікаў-русіфікатараў, а праз бацькоў — ах, якіх беларускіх! — што ў верасьні не прывялі дзяцей у садок.

Каму патрэбная беларуская мова, калі яна не патрэбная тым, хто найгучней пра яе крычыць? Мы ж білінгвы. Аднаму трэба праехаць ажно тры прыпынкі на трамваі, у другога часта ламаецца машына, у трэцяга — дзьвюхгаловая жонка (а якая цешча!), у чацьвертага — часта хварэе дзіця. Садок **быў створаны**. Дзякуй трэба сказаць тым расейскамоўным бацькам.

Мне згадваецца гісторыя ўсё з таго ж беларускага садка. Чатырохгадовая Барбарка распавяла, што яны з аднагодкам Уладкам падчас дзённага шпацыру будавалі зь лісьця **касьцёл**. У мяне сьціла дыханьне. Які вобраз! Гонкі, карункавы касьцёл з восеньскай лістоты! ...Потым я згадала і ў разуменьні разгубілася. Уладак гадуецца ў расейскамоўнай сям'і, а да таго ж не вымаўляе «р». Так, ён зграбаў лісьце на «касьцёр», на вогнішча, Барбара ж узводзіла храм... Дзеці гулялі, яны цудоўна гулялі разам, так і ня ведаючы, што **не паразумеліся**.

Білінгвізм — гэта мутацыя, гэта дыягназ, для кагосьці — нагода для гонару, для мяне — келіх ганьбы. Я хачу мець адну Радзіму, адзін, атрымманы ў спадчыну ад продкаў, дом, адну родную мову (хоць і валодаць замежнымі). Але я жыву ў гэтай краіне сёньня. І калі я чую ўхвальную оду білінгвізму, я цярплю (так, цярплю!). Я стрымліваюся. Я заплюшчваю вочы на абедзьвюх сваіх галовах. І бачу касьцёл з восеньскага лісьця — ахоплены полымем.

**Крысьціна Курчанкова, Раўбічы**

ПАДПІСКА САЛІДАРНАСЬЦІ

**Алесь Лагвінец** зь Менску падпісаў на «НН» гімназію №4 Менску. Спадарыня **Юзэфа Найдзюк** з Пасадэны (ЗША, Каліфорнія) падпісала на «НН» чатыры бібліятэкі — Жодзінскую гарадзкую, Вялейскую цэнтральную раённую, Маладачанскую цэнтральную гарадзкую і Высокаўскую гарадзкую. Вялікі ім дзякуй. Пачэсныя прыклады.

# Падпалкоўнік у Скарынаўскім




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Скарынаўскі цэнтар перажывае цяжкія часы. Супрацоўнікаў звальняюць, выпраўляюць у бясплатныя адпачынкі. Намесьнікам дырэктара ўстановы паставілі адстаўнога падпалкоўніка, які не гаворыць па-беларуску.**

Ужо некалькі гадоў Скарынаўскі цэнтар ня мае нармалёвага фінансаваньня. Бюджэтныя грошы выдаткоўваюцца толькі на навуковыя дасьледаваньні, але не на ўтрыманьне будынку ды іншыя адміністрацыйныя выдаткі. Дырэктарку Цэнтру Любоў Уладыкоўскую-Канаплянік не палохае адсутнасьць фінансаваньня з боку Мінадукацыі, якому падпарадкоўваецца ўстанова: «У нас сытуацыя ня горшая, чым 5—8 гадоў таму. Мы на гаспадарчым разьліку і павінны самі зарабляць на сябе. Гэта дае нам і вялікую свабоду».

Праўда, зь лета 2002 г. бальшыня навуковых работнікаў працуе на 0,25 стаўкі. Многіх выправілі ў адпачынак за свой кошт ці звольнілі. Сытуацыю ў Скарынаўскім цэнтры яны ацэньваюць як катастрафічную. Вінаватай у праблемах установы называюць Л.Уладыкоўскую. Маўляў, не займаецца справамі Цэнтру належным чынам.

Былы навуковы сакратар установы Баляслаў Харкевіч, звольнены ў пачатку 2003 г., кажа, што яшчэ ўлетку 2002 г. калектыў выказаў Л.Уладыкоўскай на прафсаюзным сходзе недавер. Вынікам гэтага стался звальненьне «завадатараў» — «мальдзісаўскае гвардыі»: Тацяны Махнач, Марыі Плаксы, Тамары Шкурко, Алесі Белавусавай.

Пры канцы 2002 г. Міністэрства адукацыі зладзіла рэвізію. Яе вынікі былі несуцяшальнымі для дырэктаркі: працоўнага кантракту з Л.Уладыкоўскай вырашылі не працягваць. Калі тэрмін кантракту выйшаў, кіраўнічка сабрала калектыў і разьвіталася. Пасьля гэтага, аднак, пачаліся загадкавыя зьявы.

Перш-наперш, Л.Уладыкоўская засталася на сваім месцы. Як — ня ведае ніхто. Адны кажуць, што ў Мінадукацыі было тэлефанаваньне з Адміністрацыі прэзыдэнта, іншыя называюць прозьвішча дэпутата Ігара Катлярова, кіраўніка камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе палаты прадстаўнікоў. Сама дырэктарка гаворыць, што ёй прапанавалі працягнуць кантракт: «Калі б я не пагадзілася на падпісаньне новага кантракту, сюды б прызначылі часовага выканаўцу абавязкаў і Цэнтар сам пагступова сканаў бы».

Пасьля таго ў Л.Уладыкоўскай зьявіўся новы намесьнік (на грамадзкіх пачатках, бо сродкі не дазваляюць узяць штатнага) — падпалкоўнік у адстаўцы Ігар Захаранка, кандыдат геаграфічных навук. Зьяўленьне «шэрага кардынала» супрацоўнікі схільныя зьвязваць з тым таямнічым званком з Адміністрацыі. Новы намесьнік не гаворыць па-беларуску. Адным зь першых ягоных новаўвядзеньняў стаў кантроль за тым, каб супрацоўнікі Цэнтру… не знаходзіліся ва ўстанове ў свой непрацоўны час. Так, Вольга Мазурава была выстаўленая за дзьверы з тлумачэньнем: вы цяпер ходзіце сюды, а потым будзеце ў нас патрабаваць грошы як за працоўны час. Журналісту «НН» І.Захаранка заявіў, што накont працоўнага распарадку ёсьць загад начальства: «Абмеркаваньню гэта не падлягае». Л.Уладыкоўская кажа, што прыходзіць могуць тыя людзі, якія сапраўды працуюць. «Чакаюцца вялікія скарачэньні. У Цэнтры сёньня вялікі баляст. Калісьці тут было выгадна працаваць: ніякага кантролю, заробак стабільны, хоць і маленькі… Каб Цэнтар быў саліднай установай, тут павінны працаваць прафэсіяналы».

Свае патрабаваньні да супрацоўнікаў дырэктарка выкладае ў некалькіх словах: «Я бяру новых людзей толькі з навуковымі ступенямі. Па-першае, мэнэджэраў і арганізатараў, якія б «прабівалі» праекты. Па-другое, знакамітых беларусістаў, якія б ведалі дасканала нашую культуру і беларускі кантэкст, а таксама мелі тэарэтычны склад розуму».

Праўда, адразу ж узьнікае сустрэчнае пытаньне: ці можна лічыць прафэсіяналам беларускае навукі падпалкоўніка І.Захаранку? «Гэты чалавек мае навуковую ступень і выдатныя арганізатарскія здольнасьці, а таксама — сьмеласьць заступаца за Цэнтар», — цьвердзіць спн.Уладыкоўская.

**Аркадзь Шанскі**

# «Пана Тадэвуша» пераагучаць




**Касэты зь беларускім перакладам фільму Анджэя Вайды «Пан Тадэвуш» будуць зьняты з продажу. Арганізатар перакладу Віталь Станішэўскі кажа, што вынік амаль трохгадовай працы над фільмам аказаўся ня варты таго часу і ўкладзеных сродкаў.**

Калі Беларускі відэаклюб атрымаў ад Асамблеі няўрадавых арганізацыяў грант на пераклад замежных стужак, фільму Вайды ў плянах не было. Але сталася гэта якраз пры канцы 1999 г., калі новая экранізацыя паэмы Адама Міцкевіча толькі зьявілася. За чатыры тыдні пракату яна сабрала больш за 3 млн. польскіх гледачоў. «Пана Тадэвуша» намінавалі на «Оскар-2000». Пад уплывам тае эўфарыі, відэаклюб вырашыў зрабіць беларускую вэрсію фільму.

Шмат часу пайшло на аналіз перакладаў і кампіляваньне зь іх тэксту, адпаведнага фільму. На беларускую мову «Пана Тадэвуша» перакладалі Браніслаў Тарашкевіч, Язэп Семяжон ды Пятро Бітэль. Тэкст Тарашкевіча розьніўся ад арыгіналу памерам вершу, да таго ж у ім адсутнічаў эпілёг. Ня надта суадносіўся з кінакарцінкай і пераклад Семяжона. Таму за аснову былі узяты тэкст Бітэля — ён найбольш адпавядаў задуме Вайды. Бралі й урыўкі з двух іншых перакладаў, калі асобныя месцы больш адпавядалі «карцінцы».

Ад дубляваньня фільму адмовіліся адразу — бракавала прафэсійнай тэхнікі, ад тытраваньня таксама — арганізатары трымаліся думкі, што мову трэба ўспрымаць на слых. Агучваць фільм запрасілі актораў Аляксандра Ждановіча і Сьвятлану Тарасенку. Голас Ждановіча шмат каму будзе знаёмы — колькі гадоў ім «гаворыць» адзін з пэрсанажаў «Калыханкі» Маляваныч. Сьвятлану Тарасенку памятаюць прыхільнікі тэатру «Вольная сцэна».

Удзельнікі праекту былі нібыта й задаволеныя вынікамі працы. Праслухаўшы канчатковую вэрсію, ніхто й не заўважыў, што на пачатку фільму беларускі тэкст гучыць вельмі неразборліва, зьліваецца з польскім «арыгіналам». А праз колькі тыдняў пасыпаліся нараканьні на гук. Станішэўскі кажа, што відэаклюб імкнуўся зэканоміць, бо грошай на выданьне было вобмаль — 300 даляраў. Бюджэт «Тадэвушу» — найвялікшы, калі параўнаць з выдаткамі на іншыя фільмы, перакладзеныя відэаклюбам (найлепей зь іх прадаецца «Адважнае сэрца»).

Відэаклюб вырашыў перамантажаваць гукавыя дарожкі, каб тэкст быў больш разборлівым. У сярэдзіне сакавіка беларускі «Пан Тадэвуш» мае выйсьці паўторна. Як сумленны выдавец, «Беларускі відэаклюб» абяцае замяніць касэту на больш якасную ўсім тым, хто яе ўжо набыў. А такіх на сёньня чалавек пяцьдзясят.

**Сяргей Будкін, Мікола Бянько**

КРУГЛЫ СТОЛ У ПЭН-ЦЭНТРЫ

# Гісторыя – маці нацыі

**Сукупны гадавы тыраж гістарычных пэрыёдыкаў у 2002 г. скараціўся ў параўнаньні з 1997 г. больш чым у 6 разоў. Мінулы год быў небагаты і на новыя кніжныя выданьні. Нават унікальная праца Захара Шыбекі «Гісторыя Беларусі ад канца XVIII ст. да нашых дзён», польскі пераклад якой уганараваны прэстыжнай прэміяй часопісу «Przegląd Wschodni», дасюль ня выдадзеная па-беларуску. Пра гэта гаварылася на «круглым стале» гісторыкаў і выдаўцоў, што сабраліся ў ПЭН-цэнтры з ініцыятывы «НН» і часопісу «Arche».**

Тэма паседжаньня гучала як «Беларуская гістарыяграфія на шляху да эўрапейскасьці», а ўзьніманыя пытаньні можна падзяліць на дзьве групы: беларуская гістарыяграфія і чаканьні заходніх калегаў, яна ж і чаканьні айчынных спажыўцоў.

На думку дасьледчыка ВКЛ Вячаслава Насевіча, між гэтымі чаканьнямі — прорва. Гістарычныя міты і навукова-папулярныя публікацыі дзеля нацыятворчых патрэбаў заходнія навукоўцы цяпер інтэрпрэтуюць як «нацыяналістычную гісторыю». Яна нікога не цікавіць за межамі Беларусі, бо іншыя нацыянальныя гістарыяграфіі даўно прайшлі гэты этап. Этноляг Павал Церашковіч расказаў, як немцы зь беларусамі супольна рыхтавалі нямецкі «Handbuch» па гісторыі Беларусі. Немцы не адразу прынялі канцэпцыі беларускіх удзельнікаў праекту. На думку П.Церашковіча, без папулярызацыі нацыянальных мітаў не абышлася ніводная нацыя. Тыя ж народы, якія ня мелі ў мінулым ні магутных дзяржаваў, ні вялікіх правадыроў, мусілі прыдумаць сабе легенды — як Лачплесіс у латышоў. І гэта спрацоўвала.

Да адкрыцьця памылак і драмаў нацыянальнага руху беларуская гістарыяграфія не заўжды гатовая. Для самога П.Церашковіча адкрыцьцём была кніга польскай дасьледчыцы Гелены Брадоўскай пра паўстаньне 1863 г., дзе на падставе дакумэнтаў раскрываецца трагедыя паўстанцаў. Іх выдавалі ўладам — і нават дабівалі параненых — польскія ж сяляне. Па-беларуску такую працу ўявіць сабе цяжка.

На думку рэдактара «Беларускага гістарычнага агляду» Генадзя Сагановіча, нашым навукоўцам яшчэ бракуе нацыянальнага духу, і гэта кепска. Захар Шыбека, куратар аддзяленьня гісторыі Беларускага калегіюму, наадварот, мяркуе, што гісторыя ўжо стала даволі нацыяналістычнай, і ацэньвае гэты факт станоўча. Бо безь беларусацэнтрычнага погляду на ўласную гісторыю нельга пабудаваць трывалую дзяржаўнасьць.

Узьнімаліся і больш прыватныя праблемы. Пісьменьнік Уладзімер Арлоў заклікаў да перавыданьня творчага даробку Лява Акіншэвіча. Аляксей Хадыка і Юры Голубеў пазнаёмілі з новай канцэпцыяй часопісу «Спадчына». Алесь Смалянчук з Гарадзенскага ўнівэрсытэту расказаў пра літоўскі ўзор: у Літоўскай акадэміі навук выдаюць гістарычны гадавік па-ангельску, які прадстаўляе навукоўцам усяго сьвету працы літоўскіх гісторыкаў. Такое патрэбна і нам. Але без падтрымкі дзяржавы гэткага ня выдасі, а на дзяржаўныя датацыі пакуль не выпадае разьлічваць.

Падрыхтоўка энцыкляпэдыі ВКЛ — не праява пэўнай палітыкі ўраду, а выключна адказ на рынкавы попыт, мяркуюць гісторыкі. Што яна прадасца, сумневу няма. Дарэчы, і беларускамоўны бэстсэлер №1 апошняе пяцігодкі — кніга гістарычная, «10 вякоў беларускай гісторыі» У.Арлова і Г.Сагановіча, якая вытрымала тры перавыданьні.

Яшчэ ўдзельнікі дыскусіі меркавалі, як зрабіць, каб гістарычная літаратура трапляла ў кнігарні, калі кнігараспаўсюдніцкая сыстэма «Белкнігі» «ляжыць у руінах» (выраз У.Арлова). Як зрабіць, каб у краіне рэгулярна выходзіў хоць адзін незалежны гістарычны часопіс. Ці ня варта абʼяднаць дзеля гэтага высілкі некалькіх выдавецкіх асяродкаў? На гэтыя практычныя выклікі рашэньняў пакуль не прапанавана. Да наступнага паседжаньня?

**Мікола Бугай**

Поўная стэнаграма гутаркі будзе надрукаваная ў красавіцкім нумары часопісу «Arche».

# Капрызная памяць



**Хто мае сяброў з малымі дзецьмі, той, напэўна, трапляў у сытуацыі, калі немаўляты, якія, здавалася б, павінны былі ўжо добра ведаць вас, рэагавалі на вашае зьяўленьне так, нібыта вы — абсалютна незнаёмы для іх чалавек. Ня варта крыўдаваць у такіх выпадках. Добрая памяць не даецца нам ад нараджэньня. Аддзелы мозгу, што адказваюць за яе, разьвіваюцца толькі пад канец другога году жыцьця. Дзеці да паўтара-двух гадоў зусім пазбаўлены доўгатэрміновай памяці. Пра гэта паведамляе часопіс «Nature», спасылаючыся на дасьледаваньні псыхолягаў з Гарвардзкага ўнівэрсытэту.**

## Перш чым мозг дасьпее

Здольнасьць запамінаць падзеі — заслуга непрыкметнага, характэрна выгнутага ўтварэньня з шэрага мазгавога рэчыва — гіпакампу (у перакладзе з грэцкай — конік). Дапамагаюць яму ў гэтым лобныя долі, актыўнасьць якіх асацыюе ўспаміны адзін з адным і «ажыўляе» іх у сьвядомасьці.

Як гіпакамп, так і лобныя долі ў момант нашага нараджэньня сфармаваныя не канчаткова. Такі стан трывае амаль да канца першага году жыцьця. Таму мы і не памятаем падзеяў, якія бачылі немаўлятамі.

Два псыхолягі з Гарвардзкага ўнівэрсытэту — Конар Лістан і Джэрам Каган — давялі гэта ў экспэрымэнце з малымі дзецьмі рознага веку.

## Маладая памяць — слабая памяць

«Нам хацелася высьветліць, што адбываецца ў мозгу дзіцяці недзе ад паловы другога году жыцьця да пяці гадоў, калі пачынаюць фармавацца ўспаміны», — кажа Лістан.



Навукоўцы падзялілі дзяцей на тры групы: дзевяці-, сямнаццаці- і дваццацічатырохмесячныя. Кожную групу вучылі выконваць па сыгнале кароткія пасьлядоўнасьці рухаў. Напрыклад, па сыгнале «загрымі!» малыя павінны былі па класьці ў плястмасавую бутэльку кубік, а затым патрэсьці яе. «Прыбяры» азначала выцерці дошку папяровым ручніком і выкінуць яго ў кош. «Паедзь» — пакласьці кубік на цацачны грузавік і пакаціць яго. Лістан дэманстраваў гэтыя дзеяньні шэсьць разоў дзевяцімесячным дзецям і чатыры разы — 17- і 24-месячным. Потым дзеці паўтаралі заданьні.

Пасьля чатырох месяцаў псыхолягі праверылі, што з засвоенага малыя яшчэ памятаюць. Што ж высьветлілася? 13-месячныя дзеці ня памяталі амаль нічога, у той час як 90% 21- і 28-месячных умелі паўтарыць прынамсі адно дзеяньне па дадзеным сыгнале (гэтым разам псыхолягі не паказвалі, што трэба рабіць).

— Распачынаючы досьлед, мы дапусьцілі, што гіпакамп і лобныя долі кары мозгу пачынаюць высьпяваць у людзей пад канец першага году жыцьця, — кажа Конар Лістан. — Гэтае пераканаьне падзялялі многія спэцыялісты, аднак не было экспэрымэнтальных пацьверджаньняў. Нам удалося іх атрымаць. Мы даведаліся, што дзеці да дзевяці месяцаў маюць праблемы зь фіксацыяй успамінаў і зь іх узнаўленьнем па працяглым часе.

Памяць шасьцімесячнага немаўляці сягае ў мінулае не далей як на 24 гадзіны, тады як дзесяцімесячнае дзіця здольнае прыгадаць падзеі, даўнейшыя нават за месяц!

«Мы не нараджаемся з цалкам сфармаваным мозгам, — кажа Джэрам Каган. — Працэс яго дасьпяваньня цягнецца шмат месяцаў пасьля нашага нараджэньня. Некаторыя аддзелы канчаткова афармляюцца нават праз некалькі год. На іх моцна ўплываюць зьнешнія раздражняльнікі, аднак сваю ролю адыгрывае і спадчыннасьць».

Хоць прырода і культура сумесна вызначаюць канчатковы выгляд нашай сьвядомасьці, некаторыя этапы высьпяваньня мозгу немагчыма прысьпешыць. За іх адказвае біялягічны гадзіньнік, якога не падгоніш ні спэцыяльным выхаваньнем дзетак, ні інтэнсіўнай ранньяй адукацыяй.

Таму не крыўдуйце, калі даўно ня бачаны малы пляменьнік ня йдзе на рукі ды плача. Дамо яму час. Праз некалькі месяцаў ён абавязкова вас запомніць — асабліва калі вы будзеце яму эмацыянальна неабыкавыя.

## Страх выпальвае ўспаміны

Часам людзі сьцьвярджаюць, што памятаюць падзеі, у якіх удзельнічалі, хоць ім не было яшчэ і году. Гэта магчыма, калі тыя ўспаміны былі паяднаныя зь яркімі эмоцыямі.

Эмацыйная памяць — першасная ў дачыненьні да ўсіх астатніх відаў успамінаў. Падзея, якая зрабіла на нас велізарнае ўражаньне, фіксуецца не ў гіпакампе, а ў міндалепадобным ядры — дробным фрагмэнце глыбока схаванай тканкі, якая функцыянуе ад самага нараджэньня. Чаму? Запаміналасьне падзей, якія абудзілі ў нас эмоцыі, абумоўленае эвалюцыйна. Мы мусім пачаць запамінаць іх як мага раней, каб надалей пасьпяхова ўнікаць тых зь іх, што выклікаюць страх, і імкнуцца паўтарыць тыя, што нам прыемныя.

Часам, праўда, нам здаецца, што мы памятаем, як у два гады езьдзілі на драўляным коніку ў бабулі ў хаце. І не было ў гэтым нейкіх асаблівых эмоцый. Так, успамін зь дзяцінства. Але, магчыма, гэтая сцэна была на здымку, што стаяў у гасьцёўні на паліцы? Ці бабуля расказвала пра гэта падчас кожнай сустрэчы з найдрабнейшымі дэталямі?

«Некаторыя згадкі зь вельмі ранняга дзяцінства бываюць падманныя, — гаворыць Конар Лістан. — Сямейныя аповеды могуць так трывала замацавацца ў нашай сьвядомасьці, што робяць уражаньне аўтэнтычных успамінаў. Хоць сягаюць часоў, калі нам не было і двух год. Гэта вынік намовы. Наша доўгатэрміновая памяць была тады яшчэ ў зародку».

**Падрыхтаваў Сяргей Петрыкевіч**

# Мышы і фэрамоны



**Мышы, пазбаўленыя здольнасьці адчуваць фэрамоны, ня могуць адрозьніць самца ад саміцы. Выяўляецца, што ўсё залежыць ад аднаго-адзінага гену.**

Доктар Кетрын Д'юлак з Гарвардзкага ўнівэрсытэту лічыць, што ў сысуноў існуе нават спэцыяльны пачуцьцёвы орган, які ўлоўлівае фэрамонавыя сыгналы. Навукоўцы сьцьвярджаюць, што ад фэрамонаў залежаць, між іншага, агрэсіўныя й сэксуальныя паводзіны сысуноў.

Групе навукоўцаў пад кіраўніцтвам Д'юлак пашанцавала знайсьці ключавыя малекулы, а таксама рэцэптары, ад якіх залежыць здольнасьць мышы ўлоўліваць фэрамонавыя сыгналы. Маючы ў руках «ключ» да рэакцыі на фэрамоны, Д'юлак выгадавала некалькі мышэй з мадыфікаваным генам, якія зусім не ўспрымалі фэрамонаў.

Пасьля былі экспэрымэнты. Двух генэтычна зьмененых самцоў саджалі ў адну клетку й назіралі за іх паводзінамі. Выявілася, што жывёлінкі не выказваюць нават ценю агрэсіі, — сярод нармальных мышэй у такой сытуацыі гэта было б немагчыма. Але значна больш дзіўнымі былі іх сэксуальныя паводзіны: свае любоўныя парываньні самцы пачыналі скіроўваць… у бок іншых самцоў. Хутчэй за ўсё, папросту не ідэнтыфікавалі полу сваіх калегаў і аднолькава ставіліся як да самак, так і да самцоў — заляцаліся, лезьлі адзін на аднаго, шматразова й з запалам спрабавалі пачаць капуляцыю.

Выяўляецца, што фэрамоны абсалютна не ўплываюць на прыцягальнасьць мышынай партнэркі, а толькі дазваляюць адрозьніць самца ад саміцы. Цяжка паверыць, што самец, які не ўспрымае фэрамонаў, тут ня дасьць рады: саміца розьніцца ад яго памерамі, больш далікатнай пыскай, яна выдае іншыя гукі й іначай пахне. Але самцам гэтага недастаткова, каб атрыбутаваць самку. Ім трэба яшчэ фэрамоны.

Ці можна гэтае адкрыцьцё зьвязаць з тым, што тычыцца чалавека? Напрыклад, жанчыны, якія жывуць пад адным дахам, звычайна сынхранізуюць свае месячныя рытмы. Ці вінаватыя ў гэтым фэрамоны? Д'юлак лічыць, што не. «Чалавеку фэрамоны не патрэбныя. У яго пераважае зрок. А абяцанкі фірмаў — што я папырскаюся іхнай прадукцыяй, і ўсе хлопцы адразу да маіх ног пападаюць… Гэта ўсё казкі. Мы шукалі ў гома сапіенс што-небудзь, што б адпавядала мышынаму фэрамонаваму гену, — дарма. Хутчэй за ўсё, у нас яго няма».

**М.Х.**

# Кандыдацкая з радыялёгіі

**Тэма кандыдацкай дысэртацыі Аксаны Бараноўскай, супрацоўніцы цэнтру навукова-дасьледчай лябараторыі Гарадзенскага дзяржаўнага мэдуніверсытэту, мае мудрагелістую назоў «Узьдзеяньне рэнтгенаўскага апрамяненьня на структуры скуры эктадэрмальнага паходжаньня і іх радыёпратэкцыя пантэнолам». Цікава, што праца напісаная і абароненая ў БДУ па-беларуску.**

Гэта даклінічнае абгрунтаваньне новай мэдычнай тэхналёгіі, што дазволіць папярэджваць і лекаваць радыяцыйныя пашкоджаньні скуры. Можна зразумець гонар навуковага кіраўніка — прафэсара ГрДМУ Алеся Астроўскага. «Гэта першы выпадак у нашай ВНУ за 45 гадоў яе існаваньня, каб кандыдацкую абаранялі на роднай мове», — кажа сп.Астроўскі.

Аксана Бараноўская адзіная зь сямі асьпірантаў здолела ўкласьціся ў тэрміны, вызначаныя для стварэньня навуковай работы. Прафэсар А.Астроўскі тлумачыць, што цяпер у краіне значна падвысіўся ўзровень патрабаваньняў да ахвотных атрымаць ступень кандыдата навук, ня кажучы пра доктарскую дысэртацыю.

Пасьля сканчэньня Гарадзенскага мэдуніверсытэту Аксана адпрацавала пэўны час у бальніцы роднай Сьвіслачы. Яе бацькі таксама дактары.

**Антон Лабовіч, Горадня**

# Добры і благі сьледчыя

**Расею можна зразумець. Кошт праектаў, што рэалізуюцца і абмяркоўваюцца ў межах расейска-ірацкага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, сягае 30 млрд. даляраў. У выніку вайсковай апэрацыі супраць Іраку, на якой настойвае Вашынгтон, Расея страціць мільярды — гэтыя грошы будуць «рабіць» кампаніі краінаў-«пераможцаў».**
**Расея ня мае дастатковай моцы, каб абараніць свае інтарэсы. Яе ВУП роўны 3/4 ВУП невялікіх Нідэрляндаў. Гледзячы, як зьбіраюцца хмары над Багдадам, Масква цярпліва чакала, калі больш моцныя геапалітычныя фігуры выступяць супраць вайны ў Іраку, каб да іх далучыцца.**



Казаць пра сур'ёзнае пагаршэньне амэрыканска-нямецкіх і амэрыканска-францускіх адносінаў — падманваць сябе і іншых. Эканомікі Нямеччыны і Францыі вельмі моцна зьвязаныя з эканомікай ЗША.

## Сьвет — монапалярны

Заявы Бэрліна і Парыжу адкрылі новыя гарызонты для гульні расейскай дыпляматыі. Заяўляючы пра асабістае сяброўства з Джорджам Бушам, Уладзімер Пуцін даў зялёнае сьвятло інфармацыйнай кампаніі, мэта якой — пераканаць расейскую аўдыторыю і аўдыторыю краінаў СНД ў «антыамэрыканізьме Старой Эўропы».

Расейскае кіраўніцтва добра ведае сапраўдную цану заяваў Гергарда Шродэра і Жака Шырака, таксама як і сапраўднае становішча ў NATO, пра раскол у якім сталі з такім натхненьнем пісаць і гаварыць у Маскве. Казаць пра сур'ёзнае пагаршэньне амэрыканска-нямецкіх і амэрыканска-францускіх адносінаў — падманваць сябе і іншых. Эканомікі Нямеччыны і Францыі вельмі моцна зьвязаныя з эканомікай ЗША.

Яшчэ больш залежаць краіны Старога Сьвету ад Амэрыкі ў галіне бясьпекі. Гаворка нават не пра тое, што NATO існуе галоўным чынам на амэрыканскія грошы і што краінам Заходняй Эўропы гэта даспадобы. ЗША занадта значна абагналі іх у галіне вайсковых тэхналёгіяў. Амэрыканскія выдаткі на ВПК складаюць больш за траціну ад сусьветных. Яшчэ большая амэрыканская доля ў глябальных выдатках на закупку ўзбраеньняў (каля 65%) і на вайсковыя навукова-тэхнічныя распрацоўкі (каля 75%).

І з кожным годам адставаньне краінаў NATO ад свайго заакіянскага лідэра павялічваецца. У 1998 г. вайсковыя выдаткі ЗША складалі 260 млрд. даляраў. Бюджэт Пэнтагону на 2003 г. — 400 млрд. (для параўнаньня: гадавы вайсковы бюджэт Расеі складае 10 млрд.).

Пры гэтым няма і гаворкі пра тое, што мілітарная машына «зьесьць» эканоміку Амэрыкі. Вайсковыя праграмы ў ЗША заўсёды спрыялі разьвіцьцю высокіх тэхналёгіяў. Такія праграмы, як распрацоўка зьнішчальніка пятага пакаленьня F-35 (бюджэт 35 млрд.) і праграмы супрацьракетнай абароны (7,8 млрд.) зрабілі ЗША лідэрам на сусьветным рынку навукаёмістай прадукцыі. На Штаты яе прыпадае 40% (тады як доля Нямеччыны — 16%, а Расеі — 0,3%).

Сьвет стаўся монапалярным. Але, у адрозьненьне ад Расеі й афіцыйнага Менску, ні Бэрлін, ні Парыж ня робяць заяваў, што такое становішча іх не задавальняе. Дабрабыт і бясьпека эўрапейскіх краінаў грунтуюцца на эканамічнай і вайскова-палітычнай моцы ЗША. «Ірацкія» дэмаршы з боку Нямеччыны і Францыі ня ёсьць прыкметамі расколу ў заходнім лягеры. Папросту Захад гуляе з Іракам і мусульманскім сьветам у «добрага і благога сьледчых».



## Навошта Захаду вайна

Бясьпека заходняй цывілізацыі залежыць ад палітычных працэсаў у мусульманскім сьвеце. Вельмі важна, каб у тым «катле» не зьявілася выбухоўка, якая магла б яго ўзарваць. Шмат клопату Захаду пасьля ісламскай рэвалюцыі прыносіў Іран, ягоныя антызаходнія акцыі, яго ўплыў на «вуліцу» іншых мусульманскіх краінаў. Амэрыцы і Эўропе вялікіх выдаткаў каштавала нэўтралізаваць Іран. Дзеля гэтага падчас ірана-іракскай вайны 1980—90 г. Захад дапамагаў рэжыму Хусэйна.

Вялікія страты прымусілі Іран адмовіцца ад прэтэнзій на лідэрства ў мусульманскім сьвеце. Немалую ролю ў нармалізацыі адносінаў паміж Захадам і Іранам адыгралі буйныя француская і нямецкія інвэстыцыі ў нафтаздабыўную галіну эканомікі гэтай краіны. Уварваньне войскаў Хусэйна ў Кувэйт, якое мела вынікам значнае павелічэньне кошту нафты, азначала зьяўленьне на арэне вялікай палітыкі наступнага «раздражняльніка» — Іраку.

Знакаміты расейскі ўсходазнаўца Яўген Прымакоў, кажучы пра адсутнасьць сувязяў між «Аль-Каедай» і Хусэйнам, узгадвае 1990 г. Калі войскі Хусэйна ўварваліся ў Кувэйт, бэн Ладэн прапанаваў Кувэйту й Саудаўскай Арабіі дапамогу сваіх маджахедаў. Яны гатовыя былі ўдарыць па поўначы Іраку. Аднак жа прывязка Хусэйна да «Аль-Каеды» — толькі фармальная матывацыя. Інакш звычайнаму амэрыканскаму грамадзяніну было б складана патлумачыць неабходнасьць ваяваць ці плаціць падаткі, частка якіх пойдзе на вайну. «Прывязаўшы» Хусэйна да падзеяў 11 верасьня 2001 г., можна вырашыць гэтую праблему. Закіды ягонаму рэжыму парушэньня правоў чалавека тут стаяць на другім пляне. І ўжо зусім прапагандысцкімі зьяўляюцца заявы некаторых палітыкаў аб пэрспэктывах усталяваньня ў Іраку дэмакратыі. Ніводная краіна Пэрсыдзкай затокі ня ёсьць дэмакратычнай. Дэмакратыя — гэта не расьліна, якая жыве на любой глебе.

Параза ў вайне 1990 г. не прымусіла Багдад сьцішыцца. Іракскі маштаб занадта малы для шырокай натуры Хусэйна. Яго прэтэнзіі на ролю лідэра мусульманскага сьвету, куміра натоўпаў патрабуюць адпаведнай актыўнай замежнай палітыкі. Менавіта іракскімі грашыма падтрымліваецца полымя палестынскай інтыфады супраць стратэгічнага пляцдарму Захаду на Блізкім Усходзе — Ізраілю. За тэракт на тэрыторыі габрэйскай дзяржавы сям'я шахіда атрымлівае ад Багдаду ўзнагароду — ад 5 да 25 тысяч даляраў у залежнасьці ад колькасьці ахвяраў. Гэта вельмі вялікія для жабрацкай Палестыны грошы.

ЗША доўгі час спрабавалі спыніць інтыфаду, штурхаючы Тэль-Авіў і палестынскае кіраўніцтва да мірных перамоваў. Але грошы Хусэйна заўсёды знаходзілі непадпарадкаваных Арафату прадстаўнікоў радыкальных ісламскіх арганізацыяў, і вайна на Блізкім Усходзе аднаўлялася.

Асаблівую турботу Захаду выклікала актывізацыя кантактаў Іраку з Іранам. У пачатку 2002 г. Багдад і Тэгеран заявілі аб «сумесным процідзеяньні росту амэрыканскага гегеманізму». Гульня Хусэйна з радыкальнымі ісламскімі коламі Ірану магла змарнаваць усе дасягненьні заходняй дыпляматыі, якая намагалася нармалізаваць адносіны з гэтай краінай. Пасьля сьмерці прэзыдэнта Сырыі Хафэза Асада, якога ніяк нельга было назваць сябрам Захаду, Садам прыклаў максымум намаганьняў, каб перацягнуць на свой бок новага лідэра суседняй дзяржавы — Башара Асада. У выніку той стаў у вачах Захаду сапраўдным «ястрабам». Быў пастаўлены крыж на мірных перамовах Сырыі з Ізраілем.

Хусэйн намагаецца сфармаваць антызаходні блёк з Іраку, Ірану і Сырыі. Такая «тройка» ў пэрспэктыве можа ўзарваць увесь рэгіён. Разумеючы гэта, кіраўнікі амаль усіх краінаў Пэрсыдзкай затокі прыхавана падтрымліваюць ваенную апэрацыю супраць Іраку. Удар па Хусэйну альбо стварэньне рэальнай пагрозы ўдару — папярэджаньне для Ірану і Сырыі. У дакладзе кангрэсу ЗША, прадстаўленым летась, адзначаныя намаганьні Іраку і Ірану набыць ядравую, хімічную, біялягічную зброю, а таксама ракетныя тэхналёгіі. Летась Іран заключыў з Расеяй кантракты на пастаўку ўзбраеньняў на 1,4 млрд. даляраў.

## Шанец для Садама

Дыскусія на «іракскія» тэмы засьведчыла, наколькі моцны яшчэ інфармацыйны ўплыў мае на Беларусь суседняя дзяржава. Нават лібэральна настроеныя нашыя грамадзяне, сьледам за расейскай тэлевізіяй, паўтараюць словы аб «антыамэрыканізьме Старой Эўропы» і «расколе ў NATO».

Насамрэч заявы кіраўніцтва Нямеччыны і Францыі патрэбны, каб паказаць Багдаду, што канфліктную сытуацыю яшчэ можна ўрэгуляваць мірным шляхам. Хусэйн ня можа весьці дыялёг з ЗША. Ён ня толькі кумір мусульманскай «вуліцы», але і яе закладнік. Нямеччына і Францыя далі Садаму зразумець, што ён яшчэ мае выбар, яму яшчэ ёсьць з кім размаўляць, не губляючы твару. Антываенныя заявы даюць Шродэру і Шыраку магчымасьць захаваць унутрыпалітычную стабільнасьць у сваіх краінах. Палітыкі засьведчылі мусульманскім дыяспарам Нямеччыны і Францыі, што зрабілі ўсё дзеля захаваньня міру. Але Стары Сьвет не бясконца будзе граць ролю «добрага сьледчага». Захад вуснамі «благога сьледчага» — ЗША даў зразумець Хусэйну, што яму прыйдзецца пайсьці на шмат якія саступкі.

Калі ж той адмовіцца, «добрыя сьледчыя» сыдуць — яны выканалі свае ролі. Надыдзе час «благога сьледчага» — ЗША і Вялікабрытаніі. Ні ў кога не выклікае сумневу здольнасьць ЗША сваімі сіламі вырашыць праблему Хусэйна. У студзені 1991 г. дзяржсакратар ЗША Джэймз Бэйкер заявіў міністру замежных справаў Іраку Тарыку Азізу: «Мы ўбамбім вас у пячорную эру».

Калі агрэсіўны хворы не разумее, што робіць, патрэбныя моцныя санітары для яго ізаляцыі. Шкада, што сваімі паводзінамі хворы сам сабе робіць балюча. Але варта разьмяжоўваць гуманнасьць і дурноту.

**Андрэй Ляховіч**

# Лявон Вольскі:
# Хачу паказвацца

**Рэпэтыцыйны пункт «NRM» — у найлепшых традыцыях андэрграўнду. Месьціцца ён у падвале, за дзьверцамі, на якіх напісана: «Сантэхнікі». Я прачыніла дзьверцы, і адтульываліўся мех какафоніі (Шлёма Лабандзіеўскі «зводзіў» альбом). У гнязьдзечку, высьцеленым постэрамі й «сямейнымі» чырвонымі кілімамі, я пабачыла Лявона Вольскага, міністра працы й абароны Народнай Рэспублікі Мроя. Ён падаў мне пляшку кагору й келіх. Менавіта дзеля кагору гэтае інтэрвію (54-е на Лявонавым рахунку) мае салодкі прысмак.**

Лявон Вольскі — самы папулярны і сымпатычны чалавек несавецкай Беларусі. Іранічны літаратар, авангардны мастак, бліскучы парадыст. Бясспрэчны лідэр беларускай музыкі. Музычная кар'ера — каля 20 гадоў. Аўдыторыя — ад падлеткаў да шасьцідзясятнікаў. Франтмэн двух папулярных гуртоў, дыскі якіх трымаюць лідэрства ў продажах. Пастаянна «мяняе скуру» й набывае новых слухачоў. Ня хоча быць прафэсіяналам ні ў адной сфэры сваіх заняткаў. Ня церпіць заняволенасьці. Не прэтэндуе на месца караля, але карона яму пасуе. Сябе вызначае як «вясёлага інтравэрта» й «align=розная чалавека». Другаснасьць, прэтэнцыёзнасьць і сварлівасьць ніколі не датыкалі яго.

**«НН»: Пасьля сьмерці Мулявіна месца караля беларускай музыкі засталося вакантным. Вам не падаецца, што гэты трон натуральным шляхам пераходзіць да Вас?**

**Лявон Вольскі:** Не. Не прэтэндаваў бы. Мулявін справядліва займаў гэтае месца, таму што ён натуральнейшы адмыслоўца, які займаўся ня рок-музыкай, а такой... прыгожай музыкай. Я ж займаюся сынтэтычнай творчасьцю. Я не прафэсіянал. Папісваю, нешта малюю і не хацеў бы быць каралём ніякага жанру. Я граў на гітары вельмі пагана, калі ўзяў яе ў «NRM». Але гэта дапамагала выдумляць розную лухту, уносіць сьвежы струмень, хады нейкія складаць. Пасьля Піт мне сказаў: «Толькі аматар мог такое выдумаць».

**«НН»: Мулявін здолеў папулярызаваць тое, што не было папулярным. Вы — таксама...**

**Л.В.:** Але мы ішлі да гэтага 13 гадоў, а Мулявін зрабіў усё за нейкія два-тры гады.

**«НН»: Чым Вы гэта тлумачыце?**

**Л.В.:** У Мулявіна можна прасачыць усе музычныя ўплывы стагодзьдзя, ад «The Beatles» да «Uriah Heep». Гэта культурная музыка. Самыя плённыя, таленавітыя, крэатыўныя гады былі 70-я: фальклёрныя экспэдыцыі, апрацоўка музыкі ў новай традыцыі. Ніхто гэтага не рабіў да іх. Я служыў у войску, калі ўсе слухалі «Завушніцы». Была тады такая зборка, дык зь яе слухалі «Ўчкудук» і «Завушніцы». «Сьнег кружыцца, лятает, лятает» не праходзіла. Усе гэтыя ВІА дзіка розьніліся ад «Песьняроў». Хоць потым, калі Мулявін заняўся музыкай на вершы ўсякіх дабранрававых, пахмутавых, папярэчных, у яго і гэта выйшла таленавіта.

Калі лічыць Мулявіна каралём беларускай поп-музыкі, незразумела, хто стане на ягонае месца. «Крыві», тым больш «Тройца» прэзэнтуюць мастацтва для вузкага кола людзей, магчыма, для тысячаў чалавек, але гэта не папулярная музыка. Фармат нашых поп-выканаўцаў набліжаны да расейскага, да папсы. І ясна, што яны Расеі патрэбныя так, як самі расейцы Галівуду ды заходняй поп-індустрыі.

**«НН»: Складана існаваць побач з такім монстрам, як расейская папса?**

**Л.В.:** Пра гэта лепш ня думаць. Цяжка, бо нас нідзе не паказваюць. Вось раптоўна Анатоль Вечар узьнік, як птушка Фэнікс. І ў нейкі трыццаты раз узьнік гіт-парад. Можна ўкласьці невялікія (вялікіх няма!) грошы ў кліп, пэўная частка публікі прагаласуе за яго, і тады нешта будзе круціцца месяц-два-тры. Гэта вялікая вельмі сіла. БТ — гэта адзінае месца, дзе можна паказацца.

**«НН»: Але не найлепшае. Там жа цэнзура.**

**Л.В.:** Праблема зь людзьмі на БТ — пытаньне ўнутранага цэнзара. Раз у начным этэры паказалі ж былі канцэрт «NRM», і ўсё прайшло без аніякага выклікаreceived «на кілім». Так што пытаньне цэнзуры значна перабольшанае самімі рэжысэрамі БТ. Няўжо яны думаюць, што Лукашэнка патэлефануе й скажа: «Што эта за безабразія?» Вось нядаўна даваў інтэрвію НТВ, нейкіх пару словаў сказаў. А на БТ сабраліся рэжысэры на раду, паслухалі тыя пару словаў і гавораць: «Прыдзёцца падаждаць!» А потым мы з «Крамбамбуляй» выйшлі на цалкам афіцыйны фэстываль «На скрыжаваньнях Эўропы», і ўсе закрычалі: «О, дык можна, значыць!» А выходзілі мы там з вусамі, і ніхто нічога не падумаў, ніякага намёку на іншыя вусы ня ўбачыў.

**«НН»: Вы трэці з славутых Вольскіх: Віталь, Артур, Лявон. Нейкую адказнасьць за свае словы, маніфэсты, пэрформансы адчуваеце? Вунь на Сокалава злуюць за «Мне краёў чужых ня трэба...».**

**Л.В.:** Гэта рэтраградныя закіды. Чалавек можа займацца ўсім, чым хоча. Мы гуляем, самавыяўляемся, выказваем свае ідэі. Калі нехта ідзе за намі, мы пэўную адказнасьць адчуваем. Але шмат робім лухты, пэрформансаў, песень пішам абсалютна бессэнсоўных у рэчышчы авангарду і тэатру парадоксаў. Гэта мастацтва. А пра адказнасьць калі дбаць, дык не было б ні Бэкета зь Ёнэско, ні камандаў кшталту «Блёр». Мы ж адказваем толькі за якасьць. Зрэшты... «Крамбамбулю» калі рабілі, баяліся, што споім беларускі народ. Нам расказвалі, што друкары, якія рабілі ўкладыш, пілі за кожную песьню і ўвесь час бегалі па гарэлку. Потым я падумаў: а можа, гэта нармальны спосаб адпачынку нашага народу? І «Крамбамбуля» тут была не нагодай для п'янкі, а толькі фонам.



Пытаньне цэнзуры — гэта пытаньне ўнутранага цэнзара, яно значна перабольшанае самімі рэжысэрамі БТ. Няўжо яны думаюць, што Лукашэнка патэлефануе й скажа: «Што эта за безабразія?»

**«НН»: Цікава, чаму друкары пілі гарэлку, а не абсэнт ці віскі?**

**Л.В.:** Натуральна, што цікава. Але не тлуміце галаву той сваёй адказнасьцю: мы ж не напісалі песьні пад назваю «Крыжачок».

**«НН»: «Zet» затое сьпявае: «Крыжачок, чок-чок-чок, танец сьмерці».**

**Л.В.:** Я толькі тэхнік «Zet'у» і магу адказваць за яго творчасьць як тэхнік.

**«НН»: Як тэхнік «Zet'у» і міністар «NRM», адкажыце: чаму малюеце Бацькаўшчыну чорнай фарбай? Каралеўства Наадварот, Краіна Крывавых Дажджоў, пацучарня нейкая, «Хлопчык, твая радзіма споіць цябе». Ня сорамна за гэты банал: «Ах, старонка наша гаротная, брыдкая»?**

**Л.В:** Былі такія думкі і настроі. І ёсьць у наступным альбоме. А ёсьць і абсалютна не дэпрэсіўныя. Палітра адчуваньня... за ёй ня ўсочыш. Ну хіба Менск не дэпрэсіўны, асабліва ўвосень, калі ўсё пааблазіць? А дрэвы абкарнаныя, як фэльдфэбэлі, — страшна глядзець.

**«НН»: Некаторыя параўноўваюць Менск з савецкім Бэрлінам, зь Ленінградам 70-х, з Варшавай часоў PRL...**

**Л.В.:** Ёсьць тут нейкая энэргетыка творчая. Цяпер яшчэ падсьветка праспэктаў. Халодна, сумна, малалюдна, і ампір гэты сьвеціцца поначы. Калі прыяжджаў з Польшчы Юрка Асеньнік, ён сказаў: добра вам тут, у вас тэмы пад нагамі валяюцца. Але зь іншага боку, каб ім самім такіх тэмаў...

**«НН»: Яцак Клейф, культавы польскі сьпявак, калі быў апошнім разам тут, сказаў, што несвабода дае прастору для творчасьці.**

**Л.В.:** У такіх умовах найбольш пасьпяхова разьвіваюцца экстрэмальныя кірункі творчасьці. Гепэнінг (Артур Клінаў), музыка адпаведная. Нашае мастацтва знаходзіцца на вельмі сур'ёзным узроўні.

**«НН»: Вы спэцыяльна імкняцеся выглядаць такім юным, каб прывабліваць моладзь?**

**Л.В.:** Я не ствараю іміджаў. Вось гэтую фрызуру (белыя валасы зь нейкім супэрхвосьцікам на патыліцы — **«НН»**) мне зрабілі экспэрымэнтальна. Я люблю мэтамарфозы. Нельга ўвесь час заставацца аднольkавым. Я чалавек розны.

**«НН»: Ці зьмяняецца ўспрыманьне ўласнай творчасьці з часам?**

**Л.В.:** Ну, бывае, што слухаю зь сьмехам нейкія песьні...

**«НН»: А ёсьць любімыя ўласныя рэчы?**

**Л.В.:** Я не хачу ні любіць уласнай творчасьці, ні несьці за яе адказнасьці. Пішаш, граеш, з часам ідзе натуральны адсеў песень. Мне падабаецца наш апошні альбом «Дом культуры». Я ім вельмі задаволены.

**«НН»: А цяпер пішаце што-небудзь? Малюеце?**

**Л.В.:** Даўнавасьценька вершаў не пісаў. Вершы — гэта завершаныя рэчы, яны патрабуюць зусім іншага стану духу. Ня тое што тэксты. У мяне выйшлі два зборнічкі, адзін у 1993-м, такі несур'ёзны: кроў брадзіла. А другі — у 1999-м, маленькі. І там я адказваю за кожны верш. Але і да гэтага я ня стаўлюся сур'ёзна.

**«НН»: А наконт маляваньня?**

**Л.В.:** Я малюю час ад часу, у асноўным нерэалістычныя рэчы.

**«НН»: Не спрабавалі спалучаць маляваньне й музыку — постэры, укладышы ў дыскі афармляць?**

**Л.В.:** На гэта ёсьць прафэсійныя мастакі. А калі хапацца за ўсё адначасна...

**«НН»: Ці зьбіраецеся калі-небудзь завяршыць музычную кар'еру? І ў якім веку?**

**Л.В.:** Як пясочак пасыплецца (сьмяецца). Не, гадоў у 55 сяду за пісьмовы стол. У такім веку самы час рабіцца пісьменьнікам.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

## • ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

**Увазе чытачоў. Газэта ня мае магчымасьці друкаваць абвесткі абстрактнага зьместу (кшталту тых, што раней зьмяшчаліся ў рубрыцы «ідэі»). Афармляйце свае думкі ў выглядзе лістоў і артыкулаў, калі ласка.**

### ВІТАНЬНІ

**Вітаньні** ўсім сябрам і знаёмым па выпуску 1999 г. гістфаку БДУ. Алесь Галакціёнаў

**Віншуем Веранічку** і Злату Лебедзь з 8 сакавіка! Шчасьця вам! Тацяна, Андрэйка

**Дарагая Наталка!** Ад усяго сэрца віншую цябе з Днём народзінаў і зычу самай галоўнай сустрэчы ў жыцьці. Айцец Аляксандар

**Віншую «Трыкутнік»** зь першай гадавінай! Жадаю калектыву газэты і ўсім ліцэістам зорнага шляху ў жыцьці. Чытачка газэты Марыя Сафро

**Дзякуем** усім ліцэістам і чытачам нашай газэты за тое, што вы ўжо год з намі. Трыкутнік

**Віншуем** з 1-й гадавінай любімую ліцэйскую газэту «Трыкутнік». Зычым далейшага посьпеху. Ліцэісты

### КАНТАКТЫ

**16 сакавіка** ад 12.00 да 14.30 у сквэры імя Я.Купалы ля помніка паэту адбудуцца літаратурна-патрыятычныя чытаньні, прысьвечаныя 85-м угодкам стварэньня БНР.

**Куплю** калькулятары «Электроніка». Т.: 201-60-67

**Прадаю** фары паваротныя (пярэднія) да а/м «Opel Vectra» (89—96 г.в.). Т.: (8-0296) 53-43-06 (у Гомелі)

**Паслугі** ў доступе ў Internet. Танна. Т.: (8-0296) 53-43-06 (у Гомелі)

**Прадаюцца** 3-пак. кватэры ў Менску і ў Радашкавічах. Вельмі танна. Т.: 215-31-90. Аляксандар

**Зьбіраю** любыя беларускія значкі й мэдалі. Асабліва цікавяць знакі, выпушчаныя да 1960 г., і сучасныя, выпушчаныя малымі накладамі. А/с 46, 211030, Ворша-9

**Бясплатна** дам даступныя, няшкодныя народныя рэцэпты ад аблысеньня, алькагалізму, хваробы суставаў, поўны комплекс практыкаваньняў, што аднаўляюць здароўе. Бабулі Іне, вул.Цітова, 121—15, 210021, Віцебск

**Прыму ў падарунак** кампутар. Патрэбны выключна для працы. Т.: 221-21-81

**Я** — 28 гадоў, прывабны, добры, клапатлівы, з в/а, бяз шк/зв. Ты — простая, верная дзяўчына 18—30 гадоў, бяз шк/зв. Пісаць толькі для стварэньня сям'і. Аляксандар, а/с 21, 210021 Віцебск-21

**Віцебск на Менск.** 1-пакаёвую кватэру, новую, прыватызаваную, палепшанай пляніроўкі. Т.: (0212) 36-87-06

**«І пойдуць жыхары** аднаго гораду да жыхароў другога і скажуць: пойдзем маліцца твару Госпаднямy...» Кожную нядзелю а 18-й беларускамоўнае служэньне царквы «Благадаць»: вул.Гурскага, 48

**Ці ёсьць** у Віцебску готы. Адгукніцеся. WOLF. Т.: 61-27-91

**Сп.А.Глёбусу**, які ў Гішпаніі наведаў канцэрт рок-гурту «Rolling Stones»: ня трэба гэтак катэгарычна сьцьвярджаць, што ў Беларусі немагчыма нічога падобнага! Яно ўжо было — нават поўныя стадыёны зьбіралі!

**«Стары Ольса»** і БМА перанесьлі сярэднявечную дыскатэку ў клюбе «Тунэль» на сярэдзіну красавіка

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Куплю** «Сад на капялюшыку каханай» Р.Баравіковай, «Крыло анёла» Э.Акуліна і том 4-ы бібліягр. слоўніка «Беларускія пісьменьнікі». Т.: 251-19-52

**Прадаю** цудоўныя кнігі і часопісы з хатняй бібліятэкі. Укажыце тэматыку, вышлю каталёг з указаньнем танных коштаў. Вул.Цітова, 121-15, 210021, Віцебск

**У Гомелі** можна набыць ці замовіць любыя кампутарныя CD. Т.: 45-11-51. E-mail: bandrej@tut.by

**Беларускія кнігі**, CD, аўдыё і відэа ў Гомелі. Т.: 45-11-51. E-mail: bandrej@tut.by

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**Зянон Пазьняк**. Новае стагодзьдзе. Варшава, 2002. 108 с. (пр.Скарыны, 133—147, Менск)

**www.bielarus.org** — газэта «Беларус» зь Нью-Ёрку — чытай сваё. Праўда пра беларусаў у Беларусі

**Відэафільм «Пан Тадэвуш»** можна набыць у Гомелі. Т.: 45-11-51; www.belvidea.cjb.net

**Шукаю фільмы** «Маўчаньне доктара Івэнса», «Уцёкі містэра МакКінлі» на любых носьбітах (відэакасэты, Mpeg4, DVD). Т.: 221-21-81. Слава

**Беларускія кнігі**, CD, аўдыё, відэа ў Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00

**Куплю** «Беларускую энцыкляпэдыю» з 1-га па 6-ы том. Т.: 243-09-22

**Прадам кнігу** «Byt chronologiczno-historyczny państw nowożytnych», 1844 г.в. Т.: (01593) 32-5-03

### ПРАЦА

**Шукаю** працу кур'ера. Т.: 221-21-81

**Праца** для студэнтаў. Т.: 229-65-03

**Шукаю** працу ці падзаробак, дзяўчына, 25 гадоў, адказная, валодаю беларускай мовай. Т.: (8-0296) 31-09-78. Алена

# Я нарадзіўся тут



IREX-PROMEDIA

**20 сакавіка** ў КЗ «Менск» рок-зоркі зноўку зьбяруцца разам. Гэтым разам Вольскі, Вайцюшкевіч, Памідораў, Паўлаў, Круглова і шмат хто яшчэ прасьпяваюць песьні з супольнага праекту **«Я нарадзіўся тут»**, які атрымаў адразу дзьве рок-кароны: у 2001 г. стаўся «Падзеяй году», а ў 2002-м — найлепшым альбомам. Сучасныя інтэрпрэтацыі «Паляндзу», «Не згаснуць зоркі ў небе», «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» можна будзе паслухаць у 19.00. Цана квітка 6—20 тыс. На здымку ўдзельнікі праекту «Я нарадзіўся тут» Зьміцер Вайцюшкевіч і Вэраніка Круглова

**Сяргей Будкін**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •




**Агляд-Хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2002 г.**/ ГА «Праваабарончы цэнтар «Вясна». — Менск, 2003. — 212 с.

Штогадовая сумная справаздача «Вясны» пра сытуацыю з правамі чалавека ў розных сфэрах грамадзкага жыцьця Беларусі. Факты падмацаваныя «маляўнічымі» здымкамі. Пры канцы кніжкі — паказьнік імёнаў.

**Звон.** — Магілёў, 2003. №4.

Нямногія навучальныя ўстановы могуць пахваліцца сваімі ўласнымі выданьнямі. А ў магілёўскай гарадзкой гімназіі №1 ад сакавіка 2001 г. выходзіць вучнёўская беларускамоўная газэта «Звон», якую стварылі Ўладзімер Бандарэнка і Павал Чумакоў. Сёлета ў лютым пабачыў сьвет яе чацьверты нумар. Як нескладана здагадацца, тэмаю сталася каханьне — усё ж такі Дзень сьвятога Валянціна. Аднак і безь яго тут багата разнастайных тэмаў: ёсьць спэцыфічна мясцовыя (заледзянелая дарога каля гімназіі, новабудоўлі ў Магілёве) і цікавыя шырокаму колу (рэцэнзія на альбом «NRM», новыя кампутарныя гульні). Словам, усё тое, што хвалюе магілёўскіх тынэйджэраў. Наклад газэты 299 ас.

**Куляшоў А. Дарогі:** Вершы, паэмы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 318 с.

Чарговая кніга з сэрыі «Беларуская паэзія XX ст.». У выданьні сабраныя найлепшыя вершы Куляшова, яго паэмы «Цунамі», «Далёка да акіяну», «Варшаўскі шлях», «Хамуціус». Знакамітага «Сьцягу брыгады», за які паэт атрымаў у 1946 г. Дзяржпрэмію СССР, у кнізе няма. Цана выданьня — блізу 5000 руб.

**Любецкая К. З гісторыі нямецка-беларускай, беларуска-нямецкай лексыкаграфіі і тэрмінаграфіі** / Тэрміналяг. камісія пры Міністэрстве адукацыі Беларусі; Нац. навук.-асьветны цэнтар імя Ф.Скарыны; Нав. рэд. Г.Цыхун. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2002. — 132 с.

У кнізе сабраныя зьвесткі пра ўсе выдадзеныя і нявыдадзеныя беларуска-нямецкія і нямецка-беларускія слоўнікі, створаныя ў XX ст. Наклад 200 ас. Шукайце ў «Акадэмкнізе».

**Страчаная спадчына**. — Менск: Беларусь, 2003. — 351 с.: іл.

У выданьні сабраныя зьвесткі аб шматлікіх замках, храмах, палацах, разбураных у выніку войнаў або нядбайства. Выданьне ўпрыгожанае графічнымі рэканструкцыямі помнікаў архітэктуры. Апісаньня болей за 50 палацава-паркавых комплексаў ды шляхецкіх сядзібаў. Гэтае перавыданьне, як і 1-е выданьне 1998 г., не залежваецца на паліцах. Каштуе кніга 6800 руб.

**Локотко А. Историко-культурные регионы Беларуси**. — Минск: ЕГУ, 2002. — 228 с.: іл.

У кнізе прааналізаваны сучасны стан беларускіх гісторыка-культурных, архітэктурных ды прыродна-ляндшафтных помнікаў, якія маюць значэньне для міжнароднага турызму. Распрацаваныя маршруты іх наведваньня. Выданьне мае практычную скіраванасьць. У якасьці дадатку — на 20 старонках! — зьмяшчаецца «Пералік асноўных гісторыка-культурных помнікаў Беларусі, якія ўключаюцца ў турыстычна-экскурсійны паказ». Паколькі зьвесткі ў «Пераліку» ўпарадкаваныя па абласьцях і раёнах, матэрыял прыдасца для плянаваньня ўласных вандровак па Беларусі. Цана — каля 8000 рублёў, наклад — 500 ас.

**Тацяна Вабішчэвіч**

пэйджэр: (017) 2850000, аб. 22773

КНІГІ - ПОШТАЙ

а таксама CD & Video



Адамовіч
Адамчык
Арлоў
Бартосік
Быкаў
Глёбус
Дубавец
Драздовіч
Раманюк
Сагановіч
Станкевіч

Клясыка і найноўшая літаратура, фотаальбомы, публіцыстыка, гісторыя ды іншыя

Праз пошту: п/с 333, 220050 Менск

e-mail: exlibris@tut.by

Internet: http://knihi4u.cjb.net

## Спадарыні за зялёным сталом

**У гэтыя выходныя спадарыні, якія ўмеюць трымаць у руках більярдныя кіі, будуць мець магчымасьць высьветліць, якая ж сярод іх найлепшая ў гэтым відзе спорту.** 14—16 сакавіка ў менскім більярдна-спартовым клюбе «Піраміда» адбудзецца чэмпіянат Беларусі па більярдзе сярод непрафэсіяналаў — асобна мужчынаў і жанчынаў. Каб узяць у ім удзел, трэба перад пачаткам спаборніцтваў падысьці да галоўнага судзьдзі і зарэгістравацца. Прычым ніякіх грашовых узносаў для таго не патрабуецца. Пачатак баталіяў за зялёным сталом а 10-й.

**Настасься Марыніна**

## Вандроўка па Меншчыне

**30 сакавіка МГА «Гісторыка» ладзіць вандроўку па гістарычнай Меншчыне.** У маршруце — Каралішчавічы, Сьмілавічы, Убель, Дукора, Блонь, Скрыльская Слабада, Мар'іна Горка. Ахвотным замовіць месцы просьба зьвязацца да 17 сакавіка праз тэлефоны: (8-0296) 63-29-51 (Ірына), 264-54-48 (увечары, Зьміцер), 207-00-00 аб.20672 (Віталь).

## • IN MEMORIAM •

# Ніна Абрамчык

Сумная вестка надышла нядаўна з Парыжу. Пры канцы лютага там пайшла з жыцьця вядомая дзяячка беларускага руху на эміграцыі Ніна зь Ляўковічаў Абрамчык. Лёс пакіраваў так, што спадарыня Ніна толькі некалькі дзён не дажыла да свайго 87-годзьдзя. Яна нарадзілася 10 сакавіка 1916 г. у Калузе (Расея), дзе жылі на ўцякацтве, далёка ад роднай Пружаншчыны, ейныя бацькі — Павал Ляўковіч і Антаніна з Чыжоў. Эміграцыя сталася лёсам і для іхнай дачкі. Шмат гадоў яна была вернай спадарожніцай шматгадовага прэзыдэнта Рады БНР у выгнаньні Міколы Абрамчыка.

Спадарыня Ніна была актыўнай удзельніцай беларускага палітычнага жыцьця на чужыне, арганізатаркай руху беларускіх жанчын у Францыі. У 1938 г. яна стварыла й узначаліла парыскую Беларускую жаночую грамаду імя Алаізы Пашкевіч (Цёткі). Была сяброўкай Хаўрусу беларусаў у Францыі і Сусьветнага аб'яднаньня беларускай эміграцыі, удзельніцай Першага (і пакуль адзінага) сусьветнага зьезду беларускай эміграцыі ў Парыжы ў лістападзе—сьнежні 1948 г. У друку, у тым ліку і ў адноўленай «НН», спадарыня Ніна выступала пад псэўданімам Ніна Раса.

Вечная ёй памяць!

**Ігар Лялькоў**

## • УДАКЛАДНЕНЬНЕ •

Тацяна Севярынец — гэта маці, а не сястра Паўла Севярынца, як мы памылкова напісалі ў мінулым нумары.

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______

**Імя і прозьвішча** ______

**Адрас, тэлефон** ______

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3889.

Нумар падпісаны ў друк 12.03.2003.

Замова № 1371.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а